Ніва

Тыднёвік Беларускага грамадска-культурнага таварыства

№ 20 (1055) ГОД XXI 16 МАЯ 1976 г. ЦАНА 60 гр.

Новыя вершы

АДАМ МІЦКЕВІЧ У ТУГАНАВІЧАХ

Туганавічы... Туга —
І растанні і прадчуванні!
Каштанавым цветам ранне
Стары абсыпае курган.

Дапытліва Маладосць
Удалеч глядзіць...
Трывожна
Ад гэтай смугі прыдарожнай,
Што ціш працінае наскрозь.

Запал ліхаманіць кроў...
У словах паэтавых — дзіўна —
Адна і другая радзімы,
І першая ў іх любоў.

Туганавічы...
Туга
Кахання яго і прадвесця!
Над тым, што чакае дзесьці
У полі вячэрнім — смуга
Разносіцца...
Ды зямля,
Пакутная і нямая,
Беларужовым маем
У сны яго прыйдзе пасля!

Вольга Іпатава

VIII З'ЕЗД БГКТ

БАНК ДУМАК

АБ ПАТРЭБЕ НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Навука выкрывае і раз'ясняе самыя складаныя і не ўсім зразумелыя з'явы нашага жыцця. У цяперашнім свеце адыгрывае яна галоўную ролю ў стымуліроўцы прагрэсіўнага і пастаяннага развіцця нашага грамадства.


Якімі ж дасягненнямі ў галіне навукі адзначае сваё дваццацігоддзе БГКТ?

На жаль, скромнымі. Бо два навуковыя зборнікі і навукова-літаратурны зборнік, спалучаны з календаром на 1961 год, што паявіліся за 20 гадоў існавання БГКТ, не могуць быць асновай для аптымістычна-пахвальнай ацэнкі.

БГКТ як арганізацыя ніколі не мела дакладна акрэсленых і далёкасяжных мэт для навуковай распрацоўкі якіх-колеч праблем, выступаючых сярод грамадскіх супольнасцей, у якіх дзейнічала і дзейнічае БГКТ. Навуковую працу ў рамках нашага таварыства распачалі на грамадскіх пачатках і такім жа чынам працягваюць яе надалей людзі-энтузіясты, у якіх праяўляліся натуральныя схільнасці да паказання сваёй актыўнасці ў галіне навукі. Адначасова былі гэта пераважна або актывісты БГКТ, або штатныя працаўнікі таварыства. У першым навуковым зборніку-календары на 1961 год знаходзім наступныя прозвішчы: Г. Анацік, *які піша аб Грамадзе*, П. Кожэц — *пра пачаткі рабочага руху на Беласточчыне*, А. Баршчэўскі — *публіцыстычна-літаратурная спадчына К. Каліноўскага і другі артыкул аб камізме ў творчасці Якуба Коласа*, Ул. Юзвюк — *манаграфічны нарыс аб Гайнаўскім павеце* і М. Гайдук — *аб вуснай народнай творчасці на Беласточчыне*.

У наступным навуковым зборніку, які паявіўся ў 1964 годзе, Ул. Юзвюк працягвае сваю *манаграфію аб Гайнаўшчыне*, П. Кожэц піша *аб рэвалюцыйнай барацьбе крынкаўскіх гарбароў*, А. Баршчэўскі аналізуе *польскія вершы Янкі Купалы*. Адначасова знаходзім тут новыя прозвішчы: В. Склубоўскі — *некаторыя пытанні беларускага нацыя-*

(Працяг на стар. 4)



ДУБРОВА СЁННЯ І ЗАЎТРА

Дуброўшчына з'яўляецца найлепшым доказам перамен, якія ў гэтым раёне нашай краіны здзейсніліся на працягу кароткага часу. Яе цэнтр (павятовы да новага адміністрацыйнага падзелу краіны) Дуброва — прыгожы сучасны гарадок. Ён схаваны за навакольнымі ўзгоркамі, пакрытымі каменнымі валунамі, быццам у велізарнай талерцы.

У апошнія гады ў Дуброве асабліва шмат пабудавана гандлёвых і паслуговых павільёнаў. І так, вырас прыгожы жыллёвы раён ля вуліц 1000-годдзя Польскай дзяржавы і Паўднёвай. Ёсць тут крамы, паслуговыя цэнтры. Жыхары пасёлка зрабілі пляцоўкі для дзіцячых гульняў, алейкі для шпацыраў. Яны пасадзілі таксама маладыя дрэўцы, аздобныя кустарнікі, шмат розных кветак.

Дагэтуль жыллёвы кааператыў пабудаваў звыш трохсот кватэр і столькі ж збудуе іх у бліжэйшыя гады.

Шырока разгарнулася таксама індывідуальнае будаўніцтва. Будуюцца дамы з цэнтральным ацяпленнем, вадою з крана, з жалезнай агароджай, кветкавым агародчыкам, тратуарам.

У гэтым квартале ў Дуброве будзе аддадзены ў карыстанне найбольшы гандлёва-паслуговы павільён. Разбудоўваюцца базы спулдзельні сельскагаспадарчых гурткоў (СКР) і спулдзельні шматгалінных паслуг.

Жыхары Дубровы спадзяюцца, што яшчэ ў гэтым годзе на рэчцы Каменная будзе перададзены ў карыстанне купальны басейн, а пасля яшчэ будуць добраўпарадкаваны ставы.

У Дуброве будуецца стадыён.

Сюды намерана пераехаць дырэкцыя ПГР з Макаўлянаў. Яна пабудуе тут свой жыллёвы пасёлак і свае адміністрацыйныя будынкі.

Словам, у Дуброве цікавае сёння, а яшчэ больш прываблівае заўтра.

Я. Цялушэцкі
Фота З. Лянкевіча

ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ У „Ніве"

КРАЯЗНАЎЧЫ СЛОЎНІК

АЎГУСТОВА

Мінулае Аўгустова, што ляжыць у трох кіламетрах на захад ад Бельска, тоіць столькі загадак, як мала якая іншая мясцовасць на Падляссі.

Спрабуем разгадаць найважнейшыя з іх. Першая — гэта сама назва „Аўгустова", якая ў мясцовай гаворцы вымаўляецца „Ягуштова" або „Егуштова". Гісторыкі і мовазнаўцы паўднёва-ўсходняй Беласточчыны, ідуць тут найлягчэйшай дарогай і прымаюць за чыстую манету мясцовую легенду, паводле якой гэтая вёска займела назву быццам бы ад імя караля Зыгмунта Аўгуста (1548-1572). Прыняць гэтую нічым не абаснаваную казку абазначала б збядніць гісторыю гэтай мясцовасці сама меней на 50 год, калі не болей. Усё паказвае, што радаводу назвы „Ягуштова" ці „Егуштова" трэба шукаць не ў каралеўскім імені, і не ў XVI стагоддзі, а ў іншых крыніцах і значна раней. Яна зыходзіць да эпохі, калі гэтыя землі насялялі балтыйскія плямёны. Іменна ў сучаснай латышскай мове слова „егуозніс" абазначае „невялікую далінку", „упадзіну ў полі", што цалкам адпавядае рэльефу тэрыторыі, на якой ляжыць Аўгустова. Дадайма да гэтага радавод назвы рачулкі Любкі, якая цячэ побач, і, несумненна, паходзіць з літоўскага „лёбас" — „нізіна, нізінны луг", „вузкая доўгая даліна", „даліна", „русла ракі" і г.д., а таксама назву ўрочышча „Жэрэло", якая бярэ свой пачатак калі не ад літоўскага „гerкліе" — „горла", дык ад старажытнарускага „жерело" — „крыніца". Успамагае гэтыя меркаванні факт, што на аўгустоўскім полі знаходзяцца дзве „ссыпкі", г.зн. курганы, у якіх паводле мясцовай легенды пахаваны французскія салдаты, што загінулі ў часе нашэсця Напалеона на Расію ў 1812 г. Аднак і палажэнне іх і кераміка, якую там знаходзяць, паказвае, што яны адносяцца да больш адлеглай эпохі. І хто ведае, ці доследы археолагаў не пацвердзяць часам іх яцвяжскае паходжанне. Некалькі год таму назад аўгустаўчанін Аляксей Скарбіловіч ва ўрочышчы Міжгоры вы-

(Працяг на стар. 4)

БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ-76



Удзельніцы цэнтральнага агляду — народныя спявачкі з Меляшкой. Фота Я. Цялушэцкага.

„Мінск-32“ — сімвал беларускай кібернетыкі



У вылічальным цэнтры інстытута матэматыкі АН БССР.

У гады высокага ўзроўню прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі, развіцця гандлю, камунікацыі, навукі і культуры цяжка ўявіць сабе існаванне сацыялістычнай гаспадаркі без выкарыстання электронных машын — камп'ютэраў.

Электронныя лічыльныя машыны — камп'ютэры (названне паходзіць ад англійскага слова — камп'ютэ, гэта значыць лічыць) могуць не толькі вылічаць асноўныя арыфметычныя дзеянні з вялікай хуткасцю (некаторыя тыпы камп'ютэраў дасягаюць хуткасці, роўнай 500 тысяч арыфметычных аперацый у секунду), але таксама весці бухгалтарскі разлік, пераховўаць велізарную колькасць інфармацый на магнетафонных істужках або пласцінках. Могуць таксама хутка і дакладна адшукаць патрэбную інфармацыю і, калі трэба, ператварыць і пераказаць яе адпаведнаму кіраўніку, які на падставе такой інфармацыі будзе прымаць адпаведныя рашэнні. Кіраванне тэхналагічнымі працэсамі (работай станкоў і іншых машын) можа таксама адбывацца пры дапамозе камп'ютэраў.

Гэтыя „адміністрацыйныя“ якасці электронных лічыльных машын высока ацаніла кіраўніцтва партыі і ўрада Савецкага Саюза. Камітэт навукі і тэхнікі Савета Міністраў СССР апрацаваў праграму развіцця абсталявання і выкарыстання інфарматыкі. Праграма выкарыстання інфарматыкі ахоплівае дзве асноўныя галіны:

— аўтаматызацыя кіравання арганізацыямі і ўстановамі;

— аўтаматызацыя кіравання тэхналагічнымі працэсамі.

У галіне аўтаматызацыі кіравання гаспадарчымі арганізацыямі і ўстановамі запланавана ўтварэнне агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай сістэмы збору інфармацый для планіравання і кіравання народнай гаспадаркай СССР. Сістэма будзе абапірацца на дзяржаўную сетку камп'ютэравых цэнтраў і на адналітую сетку тэлекамунікацыі. Ахоплівае яна аўтаматызаваныя сістэмы кіравання заводамі і мерапрыемствамі, а таксама сістэмы агульнага назначэння, такія, як сістэму дзяржаўнай статыстыкі, сістэму планіравання, сістэму інфармацыі і кіравання нарматывамі, сістэму апрацоўкі інфармацыі аб цэнах, банкавыя сістэмы і іншыя.

Асноўнай тэхнічнай базай працуючых ужо, а таксама планіраваных аўтаматызаваных сістэм яўляецца электронная цыфравая машына „Мінск-32“. Камп'ютэр „Мінск-32“ — гэта выраб завода імя Арджанікідзе ў Мінску. „Мінск-32“ атрымаўся на базе мадэрнізацыі і вопытных доследаў над камп'ютэрам „Мінск-22“.

Ад моманту запуска прадукцыі „Мінска-32“ завод выпусціў ужо велізарную серыю гэтых камп'ютэраў. Колькасць „Мінскаў-32“, працуючых цяпер у Савецкім Саюзе, аблічваецца трыма тысячамі. Калі б гэта параўнаць з асноўнымі камп'ютэрамі, выпрадукаванымі ў Польшчы („Зам-41“, „Одра-1304“ і „Одра-1305“), то „Зам-41“ выпрадукавана менш, чым 20 штук, „Одраў-1304“ таксама менш, чым 20 штук, а „Одраў-1305“ — некалькі дзесяткаў штук.


У гадах 1966-1970 у СССР арганізавана больш, чым 700 камп'ютэравых цэнтраў, у тым ліку на Беларусі больш, чым 60. Асноўнымі машынамі гэтых цэнтраў з'яўляюцца „Мінск-22“ і „Мінск-32“. Аўтаматызаваныя сістэмы кіравання выдатна працуюць у Беларусі на Мінскім трактарным заводзе, Мінскім гадзіннікавым заводзе, у аўтамабільным і чыгуначным транспарце. На Мінскім трактарным заводзе пры капіталаўкладаннях на аўтаматызаванае кіраванне ў суме двух мільёнаў рублёў атрыманы эканамічныя эфекты вартасцю аднаго мільёна рублёў у год. Эфекты былі вынікам росту прадукцыйнасці працы, памяншэння часу прастояў машын, росту рытмічнасці прадукцыі, адкрыцця многіх рэзерваў, а таксама дзякуючы таму, што зроблены новы, навуковы падыход да многіх працэсаў кіравання. Дырэкцыя Мінскай фабрыкі гадзіннікаў сцвярджае, што дзякуючы камп'ютэравай сістэме атрымана павышэнне рытмікі работы і паніжэнне абаротных сродкаў на адзін мільён рублёў у год. Гадавыя эканамічныя эфекты ацэнены ў паўмільёна рублёў. Паменшыўся таксама лік адміністрацыйных работнікаў.

У аўтамабільным транспарце атрымана дзесяціпрацэнтнае павелічэнне паказчыка выкарыстання самаходнага састава. Эканамічныя эфекты аўтаматызацыі кіравання чыгункай на Беларусі ацэнены ў адзін мільён рублёў у год.

У сучасны момант Мінскі завод матэматычных машын падрыхтоўваецца да прадукцыі новай электроннай лічыльнай машыны з серыі „Рад“. „Рад“ — гэта назва некалькіх тыпаў лічыльных машын адналітай камп'ютэрнай сістэмы, прынятай у сацыялістычных дзяржавах.

Уключэнне камп'ютэраў як памочнікаў разумовай працы неабходнае ў дваццатым стагоддзі, стагоддзі атама і кібернетыкі.

Янка Зданоўскі



ДРАПЕЖНІКІ МІМАВОЛІ

Жорсткая засуха, якая ахапіла рад раёнаў Эфіопіі, пазбавіла жывёлін прывычнага корму і прымусіла іх прыстасоўвацца да новых умоў. Статкі бабуінаў, якія раней стараліся трымацца далей ад чалавечага жылля, цяпер не толькі робяць пастаянныя набегі на палі тэфа (разнавіднасць проса), але і выкрадаюць хатнюю птушку, ягнят і іншых дробных свойскіх жывёлін.

Нядаўна, як паведамляе інфармацыйнае агенцтва Эфіопіі, быў зафіксаваны выпадак нападу бабуінаў на чалавека. У паселішчы Бай-Бенту (правінцыя Валега) група малпаў украла грудное дзіця, у той час як яго маці, што вартавала поле тэфа, адышла, каб прагнаць бабуінаў, якія з'ядалі ўраджай.

ДР ЕЖЫ АЛЬШЭЎСКІ



Featured title: Аб зменах клімату

Рознага роду дыскусіі на тэму змен клімату (вядома, пагаршэння) сталі частай з'явай, асабліва ў сувязі з нетыповымі, як нам здаецца, порамі года. Існуе столькі пунктаў гледжання на гэтую тэму, што немагчыма іх пералічыць. Часта гэта суб'ектыўныя адчуванні і думкі аднаго чалавека або цэлага пакалення. Кожны з нас, асабліва старэйшага ўзросту, памятае са свайго жыцця некалькі пораў года, якія памяць захавала дзякуючы іх тэмпературнай, ападкавай або іншай незвычайнасці. Напрыклад, у маёй памяці — гэта вельмі мокрае лета 1948 года, калі дождж і гразь былі пастаяннымі нашымі спадарожнікамі ў гарцэрскім лагеры, сухое лета 1959 года, калі ў казармах з вадой было горш, чым з кампотам, снежная зіма 1969/70, калі ў Белавежскай пушчы дарогі сталі глыбокімі снежнымі каньёнамі... З часам збор успамінаў, пераважна мілых, павялічваецца. Таму і гавораць, што „раней клімат быў лепшы, а цяпер тыя атамныя бомбы, спутнікі ды штучныя ўгнаенні яго папсавалі“. Такая форма адчуванняў, вывадаў, вядома, памылковая. І зразумела, што ўражанні гэтыя не пакрываюцца з нататкамі метэаралагічных установ аб тэмпературы, ападках ці сонечнай радыяцыі.

Матэрыялы метэаралагічных назіранняў за надвор'ем існуюць, галоўным чынам, за апошнія 100 год, і яны яшчэ не даюць падстаў вызначаць цыклічнасць або іншыя рэгулярнасці ў зменах клімату, але даюць магчымасць выхапіць крайнія паказчыкі, метэаралагічныя рэкорды, уласцівыя для пэўнага перыяду назіранняў. І толькі пасрэднымі метадамі, перш за ўсё дзякуючы геалагічнаму мінуламу, можам усвядоміць сабе кліматычныя ваганні, якія былі ў гісторыі Зямлі, і якія, вядома, маюць права паўтарацца.

Нарэшце спецыялісты дайшлі да выдзялення перыядаў кліматычных змен у трох катэгорыях велічынь: доўгія (некалькі дзесяткаў і соцень мільёнаў год), сярэднія (дзесяткі і сто тысяч год) і кароткія (некалькі соцень, да тысячы год). Як бачым, з нашымі сучаснымі метэаралагічнымі назіраннямі гістарычна мы яшчэ нічога сказаць не можам.

Змены клімату ў розных месцах нашага зямнога шару, якія адбываюцца ў гісторыі Зямлі, вучоныя прабуюць выясніць дзесяткамі гіпотэз. Існаванне шматлікіх поглядаў зусім не абазначае суб'ектывізму, а даказвае складанасць прычын, не заўсёды ж такіх самых для розных кліматычных змен. Некаторыя тэорыі абапіраюцца выключна на прычыны зямнога паходжання, іншыя носяць астрафізічны характар, але яны не выяснялі б, напрыклад, чацвярцічных абледзяненняў (на працягу апошняга мільёна год).

Цяжэй дыскутаваць аб ваганнях палеаклімату, бо гэта ўжо мінулае, удакументаванае геалагічнымі доказамі, але лягчэй выходзіць з тэорыямі аб зменах клімату ў будучыні, бо практычна ніхто з нас не дажыве да таго часу і не праверыць. І тут таксама трэба бачыць маштаб з'яў. Няма пераканаўчых прадпасылак, што Космас можа зрабіць нам неспадзеўку і што раптам Сонца зменіць колькасць высыланай энергіі. З бліжэйшага мінулага паўночнага паўшар'я вядома, што пачатак апошняга халоднага перыяду выступіў каля 70-50 тыс. год таму назад, а канец — каля 15-8 тыс. год, з перыядам адноснага ацяплення каля 50-30 тыс. год таму назад. Найцяплейшы перыяд быў каля 8-3 тыс. год назад, а затым перыяд апошніх 3 тыс. год быў параўнальна халаднейшы. Вядома, калі згадзіцца, што чаргаванне халаднейшых і цяплейшых перыядаў — гэта з'я-

(Працяг на стар. 4)

TELEWIZJA WARSZAWA

Sobota 15.V. 6.00 Tech. Rol. Wskaz. met. 6.30 Mat. 8.35 Takie małe miasteczko — film fab. fr. 10.00 Dla szkół (kl. VII) Zool. Ssaki różnych środ. 11.05 (kl. VIII) Geograf. Wkraczamy na rynki świata. 13.45 Tech. Rol. Mat. 14.30 Upr. rośl. 15.00 Red. Szk. zap. 15.10 Pr. I prop. 15.25 Pr. dnia. 15.30 Dzien. 15.40 Obiektyw. 16.00 Wyścig Pokoju. 17.05 Za kierownicą. 17.25 Sobota Mł. 18.25 Prosto z Polski. 19.20 Dobr. 19.30 Monitor. 20.20 Troje gwałtownych — film fab. USA. 21.55 Dzien. 22.15 Sport. 22.35 Widowisko muz. rozr. 23.25 Opow. Starszego Pana.

— - —

Niedziela 16.V. 6.20 Kurs Rol. 6.55 Przyp., radz. 7.05 Alarm przeciwpoż. trwa. 7.15 Now. w domu i zagr. 7.40 Bieg po zdr. 7.55 Pr. dnia. 8.00 Dzien. 8.10 Sport. 8.15 Spotkania Folklorystyczne. 9.00 TELERANEK. 10.30 Antena. 10.55 W starym kinie. 12.00 Dzien. 12.20 Piórkiem i węg. 12.50 Z kamerą wśród zwierz. 13.25 Nowe pios. Pro Contry. 13.55 Wyścig Pokoju. 14.20 Dla dzieci. 15.20 Wyścig Pokoju. 15.45 Los. Duż. Lot. 16.00 Wyścig Pokoju. 16.30 Refl. ob. 16.45 Wielka gra. 17.30 Rewia Targowa. 18.10 Tele-Echo. 19.15 Wieczor. 19.30 Dzien. 20.20 Bajka dla dor. 20.30 Kolekcja 1909 — film ser. fr. 21.25 Teatr Komedii: A. Cwojdziński — Sprzężenie zwrotne. 22.15 Róże Montreux. 22.35 Sport.

— - —

Poniedziałek 17.V. 12.45 Tech. Rol. J. pol. 13.25 Mat. 14.05 Politech. Kurs przyg. Mat. 14.35 Fiz. 15.05 NURT. 15.35 Pr. dnia. 15.40 Dzien. 15.50 Obiektyw. 16.10 Wyścig Pokoju. 17.10 Dla dzieci. 17.50 Student z Monachium — film ser. bułg. 18.50 Mam pomysł. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Sport. 20.35 Teatr. TV: T. Różewicz — Stara kobieta wysiaduje. 22.00 Między nami rodzic. 22.30 Dzien. 22.45 Zagr. Film Dok.

— - —

Wtorek 18.V. 6.00 Tech. Rol. J. pol. 6.30 Mat. 8.00 Kolekcja 1909 — film ser. fr. 9.00 Dla szkół (kl. I) Mat. 10.00 (kl. VI) J. pol. Spotk. z pisarzem. 11.05 (kl. III lic.) J. Szaniawski „Żeglarz". 12.55 Dla szkół śred. Rodzina współcz. 13.45 Tech. Rol. Fiz. 14.30 Bot. 15.40 Pr. dnia. 15.45 Dzien. 15.55 Obiektyw. 16.15 Wyścig Pokoju. 17.10 Przed ekranem. 17.40 Gospodarność i ja. 18.00 Stud. Mł. 18.50 Pr. publ. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Sport. 20.35 Przyp., radz. 20.40 Żołnierze — film ser. ang. 21.20 Świat i Polska. 22.05 Lektury Peg. 22.25 Dzien. 22.40 EDWARD PAŁŁASZ.

— - —

Środa 19.V. 6.00 Tech. Rol. Fiz. 6.30 Bot. 9.00 Żołnierze — film ser. ang. 10.00 Dla szkół (kl. V) Hist. Chrońmy zabytki. 11.05 (kl. VIII) Fiz. Atom i energia. 12.00 Chem. Metalurgia. 12.45 Tech. Rol. J. pol. 13.25 Mat. 14.40 Politech. Kurs przyg. Fiz. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 17.30 Los. Mał. Lot. 17.45 Nowe oblicze Laosu. 18.25 Pr. muz. 19.00 Sami o sobie. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.00 Finał Pucharu UEFA. 21.50 Filmy Bergmana: Radość ponad smutek — film fab. szw. 23.25 Dzien.

— - —

Czwartek 20.V. 6.00 Tech. Rol. J. pol. 6.30 Mat. 9.00 Dla szkół (kl. I lic). J. pol. W. Bogusławski. 10.00 (kl. II lic.) B. Prus. 10.35 Weselne dzwony — film fab. ZSRR. 13.45 Tech. Rol. J. pol. 14.30 Hod. zwierz. 15.55 Pr. dnia. 16.00 Dzien. 16.10 Obiektyw. 16.30 Wyścig Pokoju. 17.30 Ekran z brat. 18.35 Poligon. 19.00 Teleturniej. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Sport. 20.35 Przyp., radz. 20.40 Morderstwo prawie doskonałe — film USA. 22.15 Pegaz. 23.00 Dzien.

— - —

Piątek 21.V. 6.00 Tech. Rol. J. pol. 6.30 Hod. zwierz. 9.00 Dla szkół (kl. III) Międzynar. spotkanie. 9.20 Morderstwo prawie doskonałe — film fab. USA. 11.05 Dla szkół (kl. VII) Wych. ob. Przyroda i my. 12.00 Geogr. Ropa naftowa Bliskiego Wsch. 12.45 Tech. Rol. Wskaz. met. 13.25 Mat. 14.40 Politech. Kurs. przyg. Mat. 15.50 Pr. dnia. 15.55 Dzien. 16.05 Obiektyw. 16.25 Dla dzieci. 17.00 Zrób to sam. 17.25 Wyścig Pokoju. 18.30 Inf. wyd. 18.45 Eureka. 19.20 Dobr. 19.30 Dzien. 20.15 Sport. 20.35 Egzekucja w ZOO — nowela film. 21.10 Drogowskazy nr 16. 21.55 Teatr Małych Form: R. Harwood — Goście. 22.45 Dzien.

ТЭЛЕВІЗІЯ МІНСК

Piątek 14.V — 13.55 Film fab. 18.00 Flim dok. 19.30 Festiwal „Moskiewskie gwiazdy". Finał.

Sobota 15.V — 13.00 Film fab. 15.00 W świecie zwierząt. 16.25 Cyrk. 17.45 Film fab. 19.30 Pr. rozr. 20.50 Sala tańców.

Niedziela 16.V — 11.30 Film fab. 14.25 Pr. muz. 15.00 Panorama. 15.30 Filmy anim. 16.15 P. nożna. CSKA—Spartak. 18.00 Klub film. 19.30 Balet. 20.45 Wyścig Pokoju.

КІНО

Białowieża Wielki Gatsby — USA 18—19. Noce i dnie I s. — pol. 20—23.

Czyże To ja zabiłem — pol. Operacja Y — radz. 19—23.

Dubicze Cerkiewne Kartka z młodzieńczych lat — radz. Zasadzka — rum. 19—23.

Gródek Wielki Gatsby — USA 22—23.

Kleszczele Niezwykłe przygody Włochów w Rosji — radz. 18—19. Jarosław Dąbrowski — pol. 20—21.

Michałowo Tajemniczy blondyn w czarnym bucie — fr. 18—19. Osobliwa miłość — wł. 20—21. Alfredo, Alfredo — wł. 22—23.

Mielnik Dramat namiętności — kanad. — 19. Naczelnik Czukotki — radz. 22—23.

Milejczyce Wakacje we czworo — wł. 18—19. Granica miłości — wł. 20—21. Przeciw Kingowi — jug. 22—23.

Narew Fraulein doktor — jug. Jezioro starej sowy — NRD 19—23.

Narewka Charley Verrick — USA. Kobiety, które kochałem — rum. 19—23.

Nurzec Romans z zazdrości — wł. 18—19. Czarodziejskie dary — RFN 20—21. Deps — jug. 22—23.

Orla Miasto niezwykłe Warszawa — pol. Żeglarz znad Dunaju — węg. 19—23.

Rajsk Urodziny Matyldy — pol. El Dorado — USA 19—23.


B.Z.Graf. Zam. 1191 F-2

ЛЮДЗІ БГКТ

НАШЫЯ ДЫРЫЖОРЫ

Біяграфіі ў іх падобныя. І жыццёвы шлях у іх падобны. Паходзяць яны з беларускіх вёсак, што ў гміне Орля. Абодва яны па прафесіі настаўнікі, якія любяць песню і музыку. Абодва здаўна з'яўляюцца мастацкімі кіраўнікамі харавых калектываў і славяць нашу родную песню і музыку. Абодва з'яўляюцца актывістамі БГКТ і выбраны дэлегатамі на VIII з'езд Беларускага таварыства.

СЯРГЕЙ ЛУКАШУК



Нарадзіўся ў 1932 годзе. Дзень нараджэння ў яго супадае з днём нараджэння Народнай Польшчы — 22 ліпеня. Пасля заканчэння ў Бельску педагагічнага ліцэя з класамі, у якіх выкладалася беларуская мова, распачаў працу ў пачатковай школе ў вёсцы Галады непадалёк ад Бельска. Там чатыры гады настаўнічаў — вучыў і выхоўваў падрастаючае пакаленне. Калі ў Бельску арганізаваўся харавы калектыў БГКТ і калі мастацкімі кіраўнікамі яго былі Іван Шурбак і Міхась Артышэвіч, Сяргей Лукашук быў акампаніятарам, а ад студзеня 1970 года, працуючы ўжо ў Бельску, дырыжорам гэтага калектыву. Разам з ім выязджаў на канцэрты, фэстыны нават у далёкія мясцовасці. Пазней працуе Сяргей Лукашук у Галоўным праўленні БГКТ на пасадзе культурна-асветнага кіраўніка і многа ўвагі ўдзяляе развіццю мастацкай самадзейнасці ў беларускіх асяроддзях. Адначасова ўдасканальвае мастацкі ўзровень бельскага харавога калектыву, які назваўся „Васілёчкамі". „Васілёчкі" паспяхова выступалі ў многіх гарадах: Беластоку, Варшаве, Гданьску і ў былым Быдгаскім ваяводстве.

Праз два гады працы ў ГП БГКТ Сяргей Лукашук вяртаецца ізноў да школьніцтва і працуе намеснікам дырэктара пачатковай школы № 3 у Бельску, у якой выкладаецца беларуская мова. Там шмат увагі прысвячае педагагічным справам і мастацкай самадзейнасці ў школе.

Затым назначаюць яго на пасаду дырэктара Дома культуры ў Бельску, галоўным заданнем якога з'яўляецца каардынацыя культурна-выхаваўчай працы ў горадзе Бельску і гмінах былога Бельскага павету. Пад кіраўніцтвам Сяргея Лукашука бельскі дом культуры спецыялізуецца ў распаўсюджванні музыкі. У сувязі з гэтым многія музычныя мерапрыемствы Беластоцкага ваяводства будуць адбывацца ў Бельску.

А з нашым бельскім харавым калектывам зжыўся ён моцна. Да сённяшняга дня працуе з ім.

Выконваючы мноства прафесіянальнай і грамадскай працы, Сяргей Лукашук працягвае завочна вучобу ў вышэйшай музычнай школе ў Варшаве. Ужо хутка будзе абараняць ён сваю дыпломную працу.

СЦЯПАН КОПА



Сцяпан Копа паходзіць з вёскі Малінікі, якая таксама знаходзіцца ў Арлянскай гміне. Яму цяпер 31 год. З дзяцінства любіў спяваць, хацеў мець гармонік. Калі вучыўся ў сёмым класе, кіраўнік мясцовай школы пераканаў бацьку, што трэба купіць сыну гэты інструмент. І бацька купіў гармонік. Сцяпан быў шчаслівы. Дзень і ноч іграў на ім. Іграў добра. А калі моладзь з Шарнёў папрасіла, каб іграў на забаве, дык усю ноч іграў там за 25 зл. і быў вельмі задаволены, што пад яго музыку так добра танцуюць маладзейшыя і старэйшыя — удзельнікі забавы.

Вучачыся ў беларускім ліцэі ў Бельску, пазнаёміўся ён з нотамі і іграў у школьным духавым аркестры.

Пасля паступіў Сцяпан Копа вучыцца ў Настаўніцкую студыю на аддзяленне музыкі і спеву, дзе ўжо па-сапраўднаму вывучае гэтыя дысцыпліны. Закончыў НС у 1967 годзе і пачаў працаваць у пачатковай школе ў Трасцянцы. Потым пераехаў у Гарадок і там сем год працуе ў школе. Тут не толькі займаецца мастацкімі школьнымі калектывамі. Тут стаў ён дырыжорам вядомага на Беласточчыне жаночага хору, з якім многа раз выязджае на канцэрты, захапляючы слухачоў, між іншым, і беларускім песенным рэпертуарам. Ад восені 1974 года жыве ў Беластоку. Працуе ў 22-ой школе настаўнікам музычнага выхавання. У гэтай школе стварыў вакальны калектыў. У памяшканні ГП вядзе курс акардэаністаў. Нягледзячы на тое, што мае шмат рознай працы, знаходзіць час, каб пасля заняткаў у школе паехаць у Гарадок і там праводзіць рэпетыцыі з харавым жаночым калектывам БГКТ.

М. Х.

З-ЗА ПЛОТУ

У МІХАЛОВЕ СТРАШЫЦЬ!

Так то ўжо ёсць, даражэнькія! Няма таго добрага, якое б на горшае не выйшла. Ужо дзе-дзе, а ў Міхалове, здавалася б, жыць можна. Гарадок невялічкі, ціхенькі, крамы ёсць, рэстаран прыгожы, неўзабаве і вада з кранаў пацячэ. Ды маеш табе! Нячыстая сіла свінню падлажыла. Страшыць пачало. Як толькі сонца схаваецца за небасхіл і ноч пачне наводзіць свае парадкі, дык тады і давай стукаць яна па струнах сваёй чартоўскай балалайкі. Але пачаткова не выходзіла так добра, як цяпер. Не мела яна яшчэ вялікага вопыту, што менавіта і перашкаджала ў разгортванні сваёй нячыстай дзейнасці. Але жыццё ўсяму навучыць. Само падкажа, што рабіць трэба. Так было і тут. Спачатку прапалі з Міхалова ўсе электраманцёры, а потым пагасла святло на вуліцы. Ну, і лепш ужо не трэба. Ці ноч месячная, ці цёмная — хоць у башку смальні, — усё роўна. Спакойна вуліцай не пройдзеш, асабліва, калі вецярок падзьме. Як заскрыгоча, як затрашчыць, як запішчыць — то калі на нагах чаравікі большага размеру, дык так і ведай, што раніцай шукаць будзеш. Што за ліха? Як я і не думаў, як і не хацелася пераканацца, а ўсё ж такі вечарам не адважыўся швэндацца міхалоўскімі вуліцамі. Лепш ужо днём. Ну вось, і ў адзін сонечны дзянёк перанёс я сваё жыццё ў Міхалова. Вышаў з аўтобуса і стаю, разглядаючыся, не ведаючы, куды кінуцца. Ды раптам за плячыма: тра-та-тата! Так і валасы пайшлі ўгору. Але стаю, не падаючы віду, што спалохаўся, хаця сэрца даўно ў пяткі пабегла. Заціхла. Давай тады памалу назад адварочвацца. І што, думаеце?! Можа, якраз нейкае чучала з віламі прэ. Аднак, на шчасце, не гналася. Але гэта не значыць, што не было. Збоку, у некалькіх метрах ад вуліцы, стаяў, памахваючы ланцугом ды вышчарыўшы ў крывой усмешцы заржавелыя зубы, амаль двухметровы шкілет нейкага страшыдла. Вось, думаю, дзе гэты страх. Вось што палохае жыхароў. А калі так — гэта значыць, усё нармальна. Яшчэ можа нават і заслаба гэты страх наганяе. Тут некаторых міхалоўцаў трэба так напалохаць, каб забылі, на якім свеце жывуць, то можа тады б прыпомнілі, дзе ляжыць прычына страхаў.

Некалькі год назад былы дырэктар гміннага цэнтра культуры Рышард Варабей вырашыў зрабіць нешта карыснае для гэтага невялічкага гарадка, што магло б яго ўпрыгожыць. Відаць, быў чалавекам сур'ёзным, які не любіць пускаць слоў на вецер, і таму адразу прыступіў да ажыццяўлення думкі. Пагаварыўшы з вучнямі мясцовай прафесіянальнай школы, сумесна вырашылі, што ў Міхалове будзе такое, чаго не толькі яго жыхары не бачылі, але і нават навакольныя. І заняліся металапластыкай. З розных частак сельскагаспадарчых машын зманціравалі пяць сімвалічных фігур, якія, размаляваўшы і ўмураваўшы ў бетон, абгарадзілі плотам. Цудоўна ўпрыгожвалі яны невялічкі парк, што знаходзіцца ў цэнтры горада ля крыжоўкі Беластоцкай і Гарадоцкай вуліц. Але ці доўга? Я ж гаварыў — усё ідзе з поступам. Каму багнэт да касілкі спатрэбіўся, каму плот мяшаў, а хто вось проста так — не мае, дык чаму маю не паламаць! І так „грамадскім" чынам знішчылі паступова тое, чаго самі не рабілі. А цяпер дзіва, што страшыць! Ды тут сапраўды і днём можна спалохацца. Але ці гэта віна металапластыкі? Бо мне здаецца, што не. Тут больш доказаў на дурнаманію.

Хаджу між гэтымі фігурамі і ніяк уцяміць не магу: дзе „Сейбіт", дзе „Скрогат", дзе „Космас", дзе „Поступ і навука", не гаворачы ўжо пра пятую, у якой не толькі назва, але і сама яна прапала. А можа я проста не знайшоў. А з гэтых, што ёсць, адны толькі рэшткі вісяць, спяваючы жаласную песню.

Як відаць, здольныя і заўзятыя людзі ў Міхалове. Нават жалезу не даруюць. А можа б гмінны цэнтр культуры кінуў вокам на гэта...

М. Шаховіч

Аляксандра БЕРГМАН

Належыць да тых людзей, якія цесна звязалі свой лёс з беларускім рэвалюцыйным і нацыянальна-вызваленчым рухам у міжваенны перыяд і даследчай працай над гісторыяй гэтага руху ў пасляваенныя гады.

Аляксандра Бергман (дзявочае прозвішча Кучкоўская) нарадзілася 1 мая 1906 года ў Гродне. У 1923 годзе ўступіла ў рады Камуністычнага Саюза Моладзі. У 1925 годзе з'яўляецца ўжо членам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. У гэтым жа годзе яна ўжо працуе пачаткова ў Вільні, а потым у Брэсце на пасадзе акругавага інструктара КСМЗБ.

У 1927 годзе А. Бергман была нелегальна праз граніцу накіравана ў Мінск на 9-месячны курс у партыйную школу КПЗБ, пасля заканчэння якога вярнулася ў Польшчу і працавала інструктарам у ЦК КСМЗБ. У 1928 годзе як дэлегат ЦК КСМЗБ прымала ўдзел у I з'ездзе КПЗБ.

Ад паловы 1929 па 1931 год знаходзілася ў Маскве, дзе звыш года працавала на маскоўскім электразаводзе і дзейнічала ў партыйнай завадской арганізацыі ВКП(б). У 1931 годзе вучылася ў Міжнароднай ленінскай школе ў Маскве, адкуль была адклікана ў Польшчу і працавала інструктарам ЦК КПЗБ, а потым членам сакратарыята ЦК КПЗБ.

У партыйнай працы пазнаёмілася з вядомым дзеячом КПЗБ Сцяпанам Бергманам, за якога ў 1931 годзе выйшла замуж.

У 1932 годзе прымала ўдзел у нарадзе КПЗБ, што адбылася ў Берліне. У 1932 і 1933 гадах працавала ў школе КПЗБ у Мінску. У другой палове 1933 года ізноў вярнулася ў



Польшчу і працавала ў Акруговых камітэтах КПЗБ у Беластоку і на Віленшчыне.

Трэба падкрэсліць, што ўвесь час сваю нелегальную партыйную дзейнасць А. Бергман вяла сярод беларускіх сялян у вёсках Заходняй Беларусі.

Ад 1934 па 1945 год знаходзілася ў СССР. У пачатку гэтага перыяду — ад восені 1934 да канца 1935 года — працавала рэдактарам шматтыражнай завадской газеты на фабрыцы абутку ў Мінску, а потым II сакратаром партарганізацыі на заводзе сельскагаспадарчых машын у Гомелі („Гомсельмаш").

У 1945 годзе вярнулася ў Польшчу. Да 1948 года працавала на паліграфічным камбінаце ў Лодзі. У 1948 годзе пераехала ў Варшаву. Працавала ў рэдакцыі часопіса „Жыце партыі".

Ад 1960 года А. Бергман — персанальная пенсіянерка. За сваю партыйную дзейнасць узнагароджана Афіцэрскім Крыжам Ордэна Адраджэння Польшчы.

На працягу апошніх шаснаццаці гадоў А. Бергман занялася даследчай працай над гісторыяй рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, а асабліва над гісторыяй беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Надрукавала яна шмат даследчых артыкулаў у часопісах „З поля вальկі" (органе ЦК ПАРП), „Квартальніку гістарычным" (органе ПАН), „Пшэглёндзе гістарычным" (органе Польскага таварыства аматараў гісторыі), „Польскім слоўніку гістарычным", „Рочніках беластоцкіх", Беларускіх навуковых зборніках, „Ніве" і г.д. Артыкулы А. Бергман друкаваліся ў органе Саюза беларускіх пісьменнікаў „Полымі", а таксама ў „Вопросах истории КПСС".

Да найважнейшых прац А. Бергман, якія з'яўляюцца значным укладам у гісторыю беларускага руху, належаць: „Беларускі тыднёвік „Наша ніва" (1906-1915)", „Беларуская сялянска-работніцкая грамада"; „Браніслаў Тарашкевіч і левае бельведэрскае крыло"; „Антон Луцкевіч (біяграфічны эскіз)"; „Нацыянальнае пытанне ў КПЗБ" і шмат іншых.

У апошні час А. Бергман падрыхтавала да друку абшырную манаграфію аб Браніславе Тарашкевічу — як вынік шматгадовых доследаў і карпатлівых пошукаў у польскіх і савецкіх архівах. Раней А. Бергман падрыхтавала да друку польскае выданне „Пісьмаў на волю" В. Харужай і напісала абшырны ўступ да гэтага выдання. Апрацавала таксама сцэнарый выстаўкі, прысвечанай саракагоддзю „Грамады", што экспанавалася ў Акруговым музеі рэвалюцыйнага руху ў Беластоку. На падставе багатага матэрыялу А. Бергман апрацавала выстаўку, прысвечаную Браніславу Тарашкевічу, экспанаваную ў Беларускім ліцэі ў Бельску Падляшскім, якому прысвечана імя гэтага слаўнага змагара за волю і лепшую долю беларускага народа.

А. Бергман уносіць свой уклад у працу існуючага пры ГП БГКТ навуковага гуртка, членам якога яна з'яўляецца, а таксама ў лекцыйную дзейнасць варшаўскага аддзела БГКТ. У клубе на Сенаторскай А. Бергман пастаянна знаёміць сваіх верных слухачоў з тымі архіўнымі знаходкамі, якія кідаюць новае святло на многія не высветленыя дагэтуль складаныя праблемы заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Віктар Швед

(Працяг са стар. 1)

АБ ПАТРЭБЕ НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

нальнага руху, Е. Вісneўскі — *засяленне ўсходняй Беласточчыны да палавіны XVII стагоддзя* (на польскай мове), Ф. Берніковіч — *польска-беларускае супрацоўніцтва ў час студзеньскага паўстання,* А. Бергман — *манаграфічны нарыс аб Грамадзе на аснове архіўных дакументаў,* Э. Пучкоўская — *аб беларускай газеце „Наш сцяг“,* М. Пецюкевіч — *матэрыяльная культура Сакольшчыны,* Л. Раманюк — *польска-беларускія лексічныя ўзаемасувязі* і Б. Чэчуга, біолаг, — піша пра *дыхальныя пігменты ў бесхрыбетных жывёл.*

У наступным і пакуль што апошнім навуковым зборніку з 1974 года выступаюць яшчэ іншыя аўтары: М. Кандрацюк — *пра назвы вёсак на Беласточчыне,* А. Багроўская — *параўнальная характарыстыка гаворак у вёсках Сухавольцы і Семяноўка,* Б. Белаказовіч — *погляды А. Міцкевіча і А. Герцэна на беларускага селяніна,* А. Мальдзіс — *кароткае паведамленне аб літаратурных знаходках,* Ю. Туронак — *добра абгрунтаваны нарыс пра гісторыю школьніцтва на тэрыторыі цяперашняй Беласточчыны ў гадах 1773-1939.*

Гэты пералік аўтараў і тэм навуковых публікацый, якія паяўляліся пад фірмовым знакам БГКТ, дае нам уяўленне аб тым, што яны сабой прадстаўлялі. Калі аднначасова прасачыць усе тры зборнікі, дык атрымоўваем шмат якія адказы на пытанні аб тайнах нашага мінулага і цяперашняга існавання на пагранiччы ўсходняй і заходняй славяншчыны. Аднак, яшчэ больш спраў патрабуе распрацоўкі. Для прыкладу: у галіне гісторыі — першыя сялянскія хваляванні на Беласточчыне ў першай палавіне XIX стагоддзя. У Мілейчыцах і Новай Волі працягваліся яны цэлымі дзесяткамі гадоў. Сацыяльныя справы спалучыліся тут з нацыянальнымі. З галіны сацыялогіі — шматлікія праблемы паходжання, нацыянальнай прыналежнасці, асіміляцыі і грамадскага авансу беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы. І так далей, і так далей... Бо цэлая Беласточчына, ды асабліва нашы вёскі, з'яўляюцца жывой лабараторыяй для навуковых назіранняў.

Вядома, што таварыству не пад сілу шырокі падыход да навуковай распрацоўкі ўсіх гэтых праблем, бо яно дзеля гэтага не мае нічога, апрача калектыву энтузіястаў, аб'яднаных у навуковым гуртку. Аднак БГКТ можа і павінна прыняць на сябе ролю каардынатара, стымуліроўшчыка навуковых намаганняў у пажаданым напрамку. Пакуль што навуковы гурток (якім зараз кіруе заслужаны для БГКТ дзеяч і самы галоўны энтузіяст навуковай працы — Юры Туронак) наладзіў не вельмі пладатворнае супрацоўніцтва з Беластоцкім навуковым таварыствам. Неабходна праяўляць у гэтым напрамку большую актыўнасць і рашучасць. У многіх установах навуковага характару БГКТ магло б знайсці сваіх прыхільнікаў! Кафедрай беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта кіруе зараз др Аляксандр Баршчэўскі — выдатны дзеяч БГКТ. Што ж стаіць на перашкодзе, каб выпускнікі белфака ў сваіх магістэрскіх работах распрацоўвалі тэмы, пажаданыя для таварыства, каб гэтыя тэмы былі ў планах навукова-даследчай дзейнасці кафедры?

У Інстытуце славяназнаўства Польскай акадэміі навук працуе дац. Базылі Белаказовіч — наш зямляк. Ён жа галоўны рэдактар навуковага часопіса „Славія Арыенталіс“ і член рэдакцыйных камітэтаў іншых навуковых часопісаў. Чаму ж не падказаць яму, каб інстытут зацікавіўся праблемамі нашай Беласточчыны? Там жа працуюць таксама нашыя добрыя сябры: др М. Кандрацюк і др М. Чурак.

Падобныя сувязі можна наладзіць з вышэйшымі навучальнымі і навукова-даследчымі ўстановамі ў Гданьску, Шчэціне, Познані, Вроцлаве, Кракаве, Аполі і ў іншых гарадах. Можна падказваць нашым землякам, якія там працуюць, ды іншым навуковым работнікам, каб заняліся, для прыкладу, вывучэннем праблем асіміляцыі да новага асяроддзя нашых землякоў, якіх багата ва ўсіх кутках краіны, асабліва на вялікіх будоўлях сацыялізму. Як яны сябе там адчуваюць, як уладкаваліся, як укладваецца іх сужыццё з сябрамі па рабоце, якія ў іх адносіны да нацыянальнай прыналежнасці і г.д.

Мяркую, што такое супрацоўніцтва магло б быць вельмі плённым. Толькі найперш трэба ясна акрэсліць, чаго ў гэтай галіне патрабуе і спадзяецца БГКТ, трэба сістэматычна кантактавацца з гэтымі людзьмі і ўстановамі, запрашаць іх да сябе, уцягваць у праблемы, распрацоўка якіх была б для нас пажаданай і карыснай. А гэта поўнасцю пад сілу Галоўнаму праўленню БГКТ.

Віктар Рудчык

ДАРОЖНЫЯ ПАРТРЭТЫ



Валя Трушкоўская (на першым плане) працуе накладчыцай у кравецкім цэху на прадпрыемстве трыкатажнай прамысловасці „Каро“ ў Гарадку ад пачатку 1968 года. Яна выконвае 250% нормы.

Фота **Я. Цялушэцкага**

Увага, сябры Беластока!

Таварыства сяброў Беластока падрыхтоўвае абшырную манаграфію і альбом горада Беластока.

У сувязі з гэтым яно звяртаецца з сардэчнай просьбай да ўсіх, у каго ёсць якія-небудзь матэрыялы, што датычацца мінулага нашага горада. Асабліва важнымі былі б тут старыя выданні (на ўсіх мовах), старая графіка, малюнкі, акты надання, пячаці, здымкі, паштоўкі з перыяду да I сусветнай вайны, а таксама з міжваеннага перыяду і перыяду гітлераўскай акупацыі, а таксама здымкі руін і ваенных знішчэнняў.

Падораныя матэрыялы, або іх рэпрадукцыя будуць змешчаны ў спецыяльнай Памятнай кнізе з паданнем прозвішча асобы, ад якой рэч атрымана. Пазычаныя матэрыялы будуць звернуты заказной пасылкай пасля іх выкарыстання, а правы іх уласнікаў будуць ганараваца паводле абавязваючых аўтарскіх праў. Усе лісты высылайце па адрасу:

Towarzystwo Przyjaciół Białegostoku, ul. Lipowa 14, 15-427 Białystok (telefony 2-65-10, 2-64-74)

(Працяг са стар. 2)

АБ ЗМЕНАХ КЛІМАТУ

ва цыклічная, дык эпоха абледзяненняў мае права паўтарыцца. Вядома таксама, што аб размяшчэнні тэмператур і ападкаў на зямлі вырашае непасрэдна характар атмасфернай цыркуляцыі, але ведаючы гэты характар і назіраючы за пэўнымі яго зменамі, не ведаем, ад чаго яны залежаць. Эпоха абледзяненняў як з'ява, незалежная ад незямных прычын, можа зноў наступіць, але няма яшчэ выразных доказаў яе пачатку. Няма непасрэднай сувязі паміж рухамі розных ледавікоў і кліматычнымі з'явамі, і пры існуючым узроўні ведаў нельга яшчэ рабіць вывадаў аб кліматычных зменах на падставе руху ледавікоў. Немагчыма таксама прадбачыць тэндэнцыі зменлівасці ў якасцях метэаралагічных элементаў на працягу бліжэйшых соцень і тысяч год на падставе стагадовых назіранняў. Якраз з гэтага і вынікае шматлікасць розных фантастычных сенсацыйных, а часта і супярэчлівых тэорый, якія не могуць абапірацца на канкрэтныя доказы. Таму трэба трактаваць моцна мокрыя або гарачыя леты, цёплыя або надта марозныя і снежныя зімы як нешта, што ўжо бывала і толькі паўтарылася, што яно з'яўляецца скромным паўтарэннем такога стану з нядаўняга (толькі некалькі соцень або некалькі тысяч год) мінулага, і што гэта з'яўляецца характэрнай рысай нашага клімату. Не варта дашуквацца адразу кліматычных змен у адным напрамку.

Ёсць яшчэ іншы, меншы маштаб змен клімату, дзе гэтыя змены выразна вырысоўваюцца і датычаць апошніх некалькіх дзесяткаў, радзей соцень год. Лягчэй тут таксама прадбачваць змены, бо звязаны яны часта з дзейнасцю чалавека. Маю на думцы тут уплыў чалавека на клімат у межах асяроддзя (прамысловыя раёны, вялікія гарадскія або лясныя комплексы і г.д.). Умеем шляхам разбудовы гарадскіх раёнаў павысіць тэмпературу паветра ў горадзе, рэгулярнай высылкай у паветра мас пылу і газу аслабляем пранікание да зямлі сонечных праменняў, асабліва ультрафіялетавых. Штучныя ападкі ўжо не выклікаюць у нас здзіўлення, але ў шырокім маштабе было гэта прыменена з мэтай выклікаць шкоднае разводдзе ў Паўночным В'етнаме. Знішчэнне лісця на велізарных плошчах лесу (таксама ў В'етнаме) зменшыла колькасць вадзяной пары ў паветры і змяніла значна метэаралагічныя ўмовы надземнага слоя атмасферы.

З другога боку, чалавек навадняе стэпы і пустыні, засаджвае лесам пусткі, стварае штучныя азёры, каналы і рэкі. Напэўна, гэта мае ўплыў на кліматычныя ўмовы ў рэгіянальным маштабе асяроддзя. Прыгаданыя змены клімату або плануюцца або незалежна ад чалавека становяцца спадарожнікамі яго дзейнасці. Але ў большасці выпадкаў можна імі кіраваць. І ўсё часцей задумваемся, ці кліматычныя змены гэтага роду не аказваюць на нас большы ўплыў, чым натуральныя змены надвор'я і клімату. Таму не варта, здаецца, паддавацца псіхозе прадбачвання і прадказвання катастроф, выкліканых натуральнай зменлівасцю клімату, хоць узмоцненай празмерна сенсацыйнай інфармацыяй.

(Працяг са стар. 1)


АЎГУСТОВА

араў скарб сярэдневяковых манет, і гэта даказвае, што засяленне гэтых ваколіц ад балтыйскага перыяду да славянскага не мела вялікіх перапынкаў, людзі тут жылі і гаспадарылі пастаянна на працягу сама меней 1500 год.

З пісьмовых помнікаў вядома, што ў канцы XV стагоддзя кароль польскі і вялікі князь літоўскі Аляксандр надзяліў горад Бельск шасцю сёламі, у тым ліку і Аўгустовам, і ўзвёў іх жыхароў у ранг мяшчан. Гэта карэнным чынам уздзейнічае на далейшае жыццё аўгустаўчан, яны былі вольныя ад шматлікіх павіннасцей для вялікакняжацкага двара, падпарадкоўваліся толькі бельскаму войту і карысталіся значнымі свабодамі, складалі замкнутую ў сабе абшчыну. Жаніліся ці выходзілі замуж толькі ў сваёй вёсцы. Вялікім горам лічылася, калі дзяўчына мусіла з-за беднасці выйсці за хлопца з іншага сяла, або хлопец ажаніцца з дзяўчынай з іншай вёскі і пайсці туды ў прымакі. А ў вясельных абрадах амаль да апошніх год прытрымліваліся звычаю „ходіті ў дівоснубэ“, г.зн. у сваты. Малады з „маршалком“, увайшоўшы ў хату, станавіліся каля парога і не пачыналі размовы, пакуль гаспадары не папросяць іх „пэрэйті за бэлёк“. Калі такога запрашэння не было, абазначала адмову, і „кавалер“ са сваім „маршалком“ выходзілі з хаты не солана хлябаўшы. Як „кавалер“ быў да спадобы, „дівоснубаў“ запрашалі „за бэлёк“ і садавілі за стол, на які зараз жа „маршалок“ ставіў гарэлку і пачыналіся размовы пра пасаг. Яшчэ ў міжваеннае дваццацігоддзе тут бралі вялікія пасагі за дзяўчынаю, нярэдка 2-3 „загоны“ зямлі (каля 2,5 — 3,5 дзесяціны), карову, авечак, свіней, добра выладаваны „куфэрок“. Вяселле цягнулася тыдзень часу: пачыналася ў чацвер, а канчалася ў сераду. Напярэдадні шлюбу, у суботу, маладая ішла па ўсяму сялу ад хаты да хаты ды „кланялася і старому і малому“, прасіла прабачэння і благаслаўлення. Першы тыдзень пасля замужаства не мела права заходзіць да сваіх бацькоў, бо калі б пераступіла ў гэтым часе парог іх хаты, „нэ жыла бы добрэ з мужыком“.

А жыццё, нават у аўгустоўскіх мяшчан, не было лёгкае. Араць выязджалі а 2 або 3 гадзіне ўначы, што часам і палоскі свае, заехаўшы, не пазнавалі. Жніво цягнулася найменш тры тыдні. Восенню і зімой мужчыны малацілі збожжа, тупалі каля гаспадаркі, вечарамі плялі кошыкі, палукашкі, з ракіты і саломы „шылі“ сявенькі-карабкі і „банькі“ на муку (у такой „баньцы“ змяшчалася да 1,5 цэнтнера мукі), жанчыны ж не ўставалі ад верацяна, калаўротка ды красён — трэба ж было апрануць усю сям'ю. Было чым займацца і дзецям. Аўгустова славілася гадоўляй гусей. У кожнай гаспадыні было іх ад 60 да 90 штук. Гусіныя статкі пасвілі дзеці ва ўрочышчы Забалоцце, пачаўшы ад 10-гадовага ўзросту і аж да жаніцьбы або выхаду замуж. Зрэдку толькі дарослай ужо моладзі ўдавалася арганізаваць „музыкі“, на якіх мясцовы скрыпач сяк-так пілікаў полькі ды вальсы, а басаногія „паненкі“ ды „кавалеры“ кружыліся на вуліцы, падымаючы стоўб пылу ды набіваючы аб каменні балючыя „прыметы“ на ступнях.

Але пра гэта нават старэйшыя аўгустаўчане рэдка ўспамінаюць, хіба ж толькі пры нагодзе параўнання коліш-



Гэтага школьнага будынка Аўгустову магло б пазайздросціць не адно мястэчка.

Каб крамы прыгажэлі

Звоняць тэлефоны. На кожны званок рука прывычна працягваецца да трубкі, і чуваць яе прыемны, упэўнены голас. У перапынках лёгкая ўсмешка знімае з твару выраз клопату і з вуснаў выходзяць словы зусім ужо іншай



афарбоўкі. Пачынае гаварыць аб сабе. Галіна Кірылюк, маладая прыгожая дзяўчына, ужо трэці год з'яўляецца інструктарам тэхнікі і рэкламы гандлю пры бельскім ВСС-е, куды перайшла праз два гады працы у Рамесным кааператыве забеспячэння і збыту у Бельску Падляшскім. Яе прыход у ВСС быў тут пераломным момантам у галіне рэкламы. Унутранае і вонкавае афармленне той вялікай колькасці крам, якую аддаў і аддае людзям ВСС у штодзённае карыстанне, — гэта галоўным чынам плады яе фантазіі. Хопіць увайсці у першую краму, і адразу можна ўбачыць прадуманасць замыслаў, якія былі пераліты ў прыгожыя надпісы, малюнкі ці ў сценгазеты. Але не толькі адны крамы адкрывае ВСС. Ёсць жа і кафэ, і рэстараны. У апошнюю хвіліну задумоўваецца Галіна, як афарміць новую сталовую пры БППБ.

А што ў галіне рэкламы? Сумесна з кіраўніцтвам „Практычнай пані", дзе ВСС мае свой клуб, наладжвае яна розныя паказы. Арганізуе таксама кірмашы тавараў. Нядаўна быў такі кірмаш у Беластоку.

Г. Кірылюк умела спалучае грамадскую працу з прафесіянальнай. Стаўшы старшынёю гуртка ЗМС, яна ажывіла яго дзейнасць, і гурток выйшаў на першае месца ў Бельску. Дзейнасць гэтага гуртка зводзілася да апекі над крамамі і маладымі працаўнікамі, якім, каб дапамагчы ў працы, падбіралі „настаўніка" сярод прадаўшчыц, маючых практыку. Каб усё гэта праходзіла спраўна, арганізоўвалі конкурсы на найлепшага апекуна. Апрача гэтага, Галіна Кірылюк робіць газету, якую рэгулярна адсвяжае новымі матэрыяламі. Змяшчае тут усё — і рэчы пахвальныя і крытычныя.

Галіна Кірылюк і сакратар гарадскога аддзела Фронту адзінства народу. За сваю плённую працу была ўзнагароджана сярэбраным знакам імя Я. Красіцкага. З'яўлялася яна таксама адной з дзесяці асоб Беласточчыны, якіх выбралі дэлегатамі на кангрэс маладзёжных арганізацый у Варшаве.

Памінаючы ўжо ўсю працу, трэба сказаць, што Галіна Кірылюк пасля заканчэння эканамічнага тэхнікума ў Бельску вырашыла прадаўжаць вучобу. З'яўляецца яна цяпер студэнткай першага курса Адміністрацыйнага права ў Беластоку. Працы, як відаць, шмат. Але, калі хацець, то з усім можна справіцца.

М. Шаховіч

Фота Я. Цялушэцкага

Ф·А·Л·

вя

Moderato

За - сту - ча

ні на дво - рэ,

зо-ло-ты куб-кі н

Застучалі вороны коні на дворэ,
зазвінелі золоты кубкі на столе,
зазвінелі золоты кубкі на столе.
Як учула молода Кася ў коморы
ой, упала своёй матулі ў ноги,
ой, упала своёй матулі ў ноги:
— Ой, не дай, не дай, моя матул
хоць р

Ад Марыі Лубнеўскай, 1914 года нараджэння, і Чаславы Катовіч, 1940 года нараджэння, вёска Ахрэмавічы гм. Заблудаў, запісаў 5 лістапада 1975 г. М. Гайдук. Нотная транскрыпцыя з магнетафоннай стужкі Людмілы Панько.

Ці ведаеце, што...

...у гэтым годзе ў нашай краіне сельскагаспадарчыя гурткі атрымаюць 13 000 новых трактараў, 1 600 збожжавых камбайнаў, 1 500 камбайнаў для капання бульбы, 260 камбайнаў для буракоў.

...у Беластоцкім ваяводстве дзейнічае 177 бібліятэк і філіялаў, у тым ліку 153 — гэта вясковыя бібліятэкі і філіялы. (ця)

Варшаўскі вечар „Белавежцаў"

Даволі доўгі ўжо час, дзякуючы ініцыятыве і энергіі варшаўскіх дзеячоў нашага таварыства адбываюцца (у асноўным у чацвяргі) дыскусійныя вечары і сустрэчы з цікавымі людзьмі. І так, у сакавіку г.г. з удзелам А. Бергман успаміналі тут аб прагрэсіўнай дзейнасці Грамады і КПЗБ і іх супрацоўніцтве з польскім рэвалюцыйным рухам; генезіс і сучасны стан беларускага школьніцтва ў Польшчы прадставіў Ю. Туронак, а супольна з Ф. Галёнкам пазнаёміў ён прысутных з 55-гадовымі гаспадарчымі і культурнымі дасягненнямі Савецкай Беларусі.

У другую нядзелю красавіка варшаўскія любіцелі беларускай літаратуры мелі магчымасць сустрэцца з трыма вядомымі членамі літаб'яднання „Белавежа".

І так, Ян Чыквін прадставіў сваё апавяданне „Праклятая фармуляроўка", сатыру „Наваголні семінар літаратурнай групы" і некалькі вершаў: „На соннай Нарвы вадзе", „На смерць іспанскага паэта Ф. Г. Лоркі", „Гожая дзяўчына" і інш.

Непрафесіянальны літаратар Юрка Геніуш прачытаў прадстаўленую ў сатырычным святле „Нядзельную сустрэчу літаратурнай арыстакратыі", а ў „Лісце да Віктара Шведа" ў фрывольным, але сімпатычным святле паказаў жыццё нашага ўжо 50-гадовага паэта. У мініятурнай паэме „Афрыка", абапіраючыся ў нейкай ступені на Чыквінаў верш, напісаны на 40-годдзе смерці іспанскага паэта, Геніуш паказаў актуальную яшчэ праблему поўнага вызвалення „Чорнага мацерыка", справе якога аддаў сваё жыццё Патрык Люмумба.

Апошнім з літаратурнага трыо выступіў Сакрат Яновіч, напамінаючы сваім чытачам некалькі апавяданняў са зборніка „Загоны" і кніжкі „Wielkie miasto Białystok".

У другой частцы вечара навуковы супрацоўнік Варшаўскага універсітэта дац. др Флорыян Няўважны даў абшырную і, бадай, трапную характарыстыку творчасці выступаючых на вечары „белавежцаў" на шырокім фоне айчыннай і савецкай беларускай творчасці. Асабліва падкрэсліў ён моцную сувязь іх творчасці з домам і роднай зямлёю, хаця ў кожнага з аўтараў яна выражаецца інакш.

Людзі старэйшага і сярэдняга пакалення, якія ўдзельнічалі ў вечары роднай літаратурнай творчасці, уважліва ўслухоўваліся ў галасы аўтараў і ў мелодыю роднай мовы, на якой напісаны іх творы. Усё ж нячаста даводзіцца ім чуць гэтую мову і карыстацца ёю. Літаратура гэта набліжае іх да ідэй і спраў, ад якіх яны ў значнай ступені ўжо адарваныя, а ўсё ж дазваляюць успомніць маладыя, хаця нялёгкія гады.

Інакш падыходзяць да гэтай літаратуры маладыя людзі, якія толькі нядаўна пасяліліся ў сталіцы і вучацца або працуюць тут, даволі часта наведваючы свае родныя мясціны. Вось адзін з нямногіх прадстаўнікоў гэтага маладога пакалення, бадай, расчараваны ўжо і поўны сумненняў. Ён якраз высоўвае ў дыскусіі праблему такога менавіта літаратурнага героя, поўнага расчараванняў, якога, як сцвердзіў, нельга знайсці ў творчасці нашых літаратараў.

Спор, які выклікаў гэты юнак, магчыма, мае шанцы знайсці аб'ектыўную праўду нашых часоў. Дык няхай жа прадаўжаецца ён і пасля аўтарскай сустрэчы.

Міхал Жанчэўскі

няга з сённяшнім. А сённяшняе ўпісваецца ў Аўгустове сапраўды „гарадскімі" двухпавярховымі мураванымі віламі, прыгожымі дамамі-асабнякамі, абшырнымі хлявамі-фермамі, трактарамі і легкавымі машынамі. У дамах уже не гонар мець разрозненую мэблю, будзь яна і „на высокі бляск", штораз часцей тут набываюць дарагія і люксусныя камплекты „Пушча", „Ломжа" і іншыя, а сціральныя машыны, халадзільнікі, тэлевізары і іншае сучаснае хатняе абсталяванне назаўсёды ўвайшло ў быт. Зрэшты, не адно дабрабытам у штодзённым жыцці раўняецца Аўгустова на перадавых. Адсюль паходзяць Юрка і Мікалай Бусловічы — навуковыя працаўнікі Варшаўскага палітэхнічнага інстытута, Надзея Асіпюк — фармаколаг, Васіль Заброцкі — лекар, Рыгор Анацік — намеснік дырэктара Бельскага беларускага ліцэя, шмат настаўнікаў і спецыялістаў іншых дзялянак гаспадаркі і жыцця нашай краіны. Многа моладзі яшчэ вучыцца. У асноўным сярэднюю адукацыю яна здабывае ў Бельскім беларускім ліцэі.

Сучаснасць трывала ўвайшла і ў тутэйшую гаспадарку. Тут людзі кантрактуюць многа збожжа, бульбы, ільну і іншых раслін, з размахам займаюцца гадоўляй быдла і свіней. Для прыкладу, Барыс Навіцкі — малады селянін — на сваёй 16-гектаровай гаспадарцы гадуе звыш 20 штук быдла, 20 штук свіней, каля 30 штук авечак, мае ўласны трактар з камплектам машын; таксама Сяргей Казак трымае многа жывёлы, вырошчвае высокія ўраджаі; Янка Бусловіч — малады хлопец — гаспадарыць з маткай, трымаюць 16 штук кароў, штогод прадаюць дзяржаве па 20 штук кормнікаў. Зрэшты, у кожнай сярод 130 аўгустоўскіх гаспадарак знойдзецца нешта добрае, бо людзі тут дбайныя і гаспадарлівыя. Узорам жа для ўсіх з'яўляецца гаспадарка Рыгора Анацька — намесніка дырэктара Бельскага беларускага ліцэя, які і ў ліцэі належыць да перадавых педагогаў і ў сяле з'яўляецца адным з найлепшых гаспадароў. Толькі ў мінулым годзе ён здаў дзяржаве 11 штук быдла, якое пайшло ў экстракласу. Узначальвае вёску солтыс Янка Заброцкі — таксама добры гаспадар, у яго 12 штук быдла, трактар і ўсе машыны, высокія ўраджаі на палях. Я. Заброцкі — гэта адданы справе грамадскі дзеяч, член Экзекутывы Ваяводскага камітэта ПАРП, радны гмінай рады нарадовай, актыўны дзеяч шэрагу сельскагаспадарчых арганізацый. Па яго ініцыятыве аўгустаўчане толькі ў мінулым годзе выканалі грамадскім чынам працы вартасцю ў 70 тыс. зл., а ў бягучым годзе намерваюцца перабудаваць рамізу, збудаваць новую краму, пракласці тратуары ў вёсцы. Яго ўклад у развіццё сяла высока ацэнен грамадствам, ён узнагароджаны Кавалерскім Крыжам Ордэна Адраджэння Польшчы, Бронзавым Крыжам Заслугі, медалямі.

Так. Старажытнае Аўгустова знайшло сваё пачэснае месца ў нашай сучаснасці і ідзе з ёю крок у крок.

Мікалай Гайдук

Фота аўтара



Яму 40 год. Жыве ў Бельску Падляшскім. На Беласточчыну прыехаў з Пазнанскага ваяводства. Жанаты. Сыны ва ўзросце 13 і 14 год.

Клічуць яго проста Куба. А і сапраўды называецца Куба Зялінскі. Працуе шафёрам у раённай пажарнай камандзе ў Бельску. Гэты саракагадовы мужчына, вядомы ў прадпрыемстве, як добры працаўнік, а сярод сяброў, як ветлівы калега. Аб ім многа гаворыцца на Бельшчыне, таксама, як аб вопытным пчаляру, таму, што ён і сапраўды добры пчаляр.

Гаспадарка Кубы Зялінскага размяшчаецца ў трох раёнах: у Кнарыдах, Горнаве і ў Хранібарах (калонія Быстрае). У яго пасекі 150 вулляў. Цяжка прымірыць прафесіянальную працу з так агромным мерапрыемствам, як вядзенне пасекі з 150 вуллямі. Ён аднак не наракае. Наадварот, на ўспамін аб пчолах і аб пасеках, яго твар робіцца светлым, задаволеным.

— Пчалярства — гэта маё гарачае пачуццё, — гаворыць Куба Зялінскі. — Таму яму якраз прысвячаю свае вольныя хвіліны. Дзе ж можна знайсці лепшае задавальненне, як не на пасецы? Араматныя пахі, бзыканне пчол і вольны вецярок — гэта ж сапраўдная паэзія!

А другая справа — гэта грашовая карысць. У мінулым годзе атрымаў ён у сярэднім 20 кг мёду з аднаго вулея. Калі памножым на 150, дык атрымаем 3.000 кг. Дзяржава плаціць пчалярам па 60-70 зл. за 1 кг.

— Скажыце, калі ласка, дзе вы навучыліся гэтай прафесіі?

— У маіх родных мясцінах пчалярства стаіць на высокім узроўні. Многа я наслухаўся ад нашых пчаляроў аб той прафесіі і аб карысцях, якія яна прыносіць. Пачаў цікавіцца, чытаць прафесіянальныя кніжкі. Пасля, для практыкі, купіў некалькі вулляў...

— А як дабіліся такіх поспехаў у сваёй гаспадарцы?

— У 1971 годзе прадпрыемства „Лес" прадавала вуллі. Я і купіў 70 штук. А пасля кожны год прыбаўлялася.

— Вашы планы на будучыню?

— Думаю павялічыць сваю пасеку да 200 вулляў, на больш час не дазволіць. І хоць ёсць у мяне ўсе патрэбныя прылады, аўтамабіль „Люблін" і „Тарпан", не змагу весці большай колькасці.

Развітваемся.

— А не забудзьце завітаць да мяне летам на мёд, — крычыць Куба наўздагон.

Ул. Сідарук

ВЕР-НЕ-ВЕР

строн! Я сістэматычна чытаю тваю рыку. І вось вырашыла і я запыцца ў цябе. Пазнала я аднойчы хлоп- Толіка. Спачатку мы былі толькі брымі знаёмымі. Потым пачалі хаіць сур'ёзна. Але ўсё змянілася, калі дарогу мне ўвайшла адна дзяўчына. олік пакінуў мяне. Я моцна перажыала гэта. Думаю часта аб ім. Аднойы прысніўся мне сон, які, можа, прадвяшчае нейкі пераварот у маіх справах. Сніцца мне, што Толік прыйшоў да мяне дахаты. Нічога не гаварыў мне. Стаў каля вакна, выняў з кішэні абручальнае кальцо і надзеў перада мною сабе на палец рукі. Потым узяў касцюм сівога колеру і пачаў прышываць гузікі. Я нічога не гаварыла і не памагла яму прышываць гузікі, хаця сама я краўчыха. Вельмі часта сняцца мне кольцы. Аднаго разу мне прыснілася, што я была ў лесе, збірала грыбы і знайшла абручальнае кальцо, якое надзела сабе на палец. Потым снілася мне зноў, што на маіх руках былі розныя пярсцені і кольцы.

Дарагі Астрон, я прашу цябе, каб ты не адцягваў з адказам, таму што я ўсё-такі думаю аб гэтым сне. З вялікім паважаннем

Аня з Беластока

Дык і адказваю. Хлопца вашага чакае вяселле (можа ажэніцца ён з той дзяўчынай, што ўвайшла табе ў дарогу?..) Факт, што, бадай, не ажэніцца з табой (абручальнае кальцо пры табе надзеў толькі сабе). А ўсё будзе адбывацца на тваіх вачах, і будзе табе вельмі крыўдна. Ажэнак яго, аднак, не будзе такім вясёлым, можа, ажэніцца ён пад нейкім прымусам.

Табе на пацеху магу сказаць, што чакае цябе каханне з узаемнасцю (ты ж збірала грыбы ў лесе), але не будзе гэта той першы хлопец. З гэтага ўзаемнага кахання зродзіцца добрае і гучнае вяселле (кальцо ж ты знайшла ў лесе), чаго і жадае табе ад усяго сэрца

Астрон

P.S. Шкада, што не напісала, якія бачыла на сваіх пальцах пярсцёнкі. Каштоўнасці наогул могуць абазначаць нейкі фальш і залежнасць ад іншай асобы (ці не ад будучага мужа?..)

Куток практычных ведаў



ЯК МЫ СТАРЭЕМ?

Ад старасці не ўцячэш — гэта факт. Але старасць можна і прыспешыць і аддаліць ад сябе. Усё залежыць ад таго, ці мы ўмеем старэць. Уменне старэць можа быць рысай, характэрнай для данага чалавека ад яго маладых год, але гэтую рысу можна таксама набыць. Можа, гэта гучыць і парадаксальна, але вопыт паказвае, што не старэюць толькі тыя, хто не мае на гэта часу. Адным словам, людзі, якія жывуць „на поўных абаротах“, аднак, рацыянальна эксплуатуючы свой арганізм. Важным з'яўляецца таксама ўменне весці інтэнсіўнае разумовае жыццё. Такім чынам, каб старасць прыйшла да нас як найпазней, трэба захоўваць і ў пазнейшыя гады свайго жыцця ўсе свае зацікаўленні, многа чытаць, многа знаходзіцца сярод людзей, трымаць руку „на пульсе“ спраў, цешыцца і перажываць усё навокал, як у маладыя гады.

Варта аднак ведаць, што старэем мы няроўна. Але як?

Вочы старэюць найхутчэй. Вострасць зроку пачынае слабець ад 5 год.

Валасы таксама пачынаюць старэць вельмі рана — пачынаючы ад 20 год. Асабліва пагражае гэта валасам мужчын, якія ўжо ў гэтым узросце пачынаюць няраз лысець.

Скура траціць сваю эластычнасць перш за ўсё ў выніку адвадnення арганізму. Сцверджана, што паміж 25 і 70 гадамі колькасць вады ў арганізме змяншаецца з 61 да 53 прац. Першыя маршчыны (так званыя мімічныя) паяўляюцца ўжо ў дваццацігодкаў.

Мышцы слабеюць у 25-30 гадоў. Занікае сіла, хутчэй стамляемся. Асабліва слабеюць усе тыя, хто вядзе седзячае жыццё.

Слых слабее і тупее ўжо ў 30 гадоў.

Сэрца і крываносная сістэма старэюць пасля 35 год. Каб гэты працэс наступіў як найпазней, неабходна весці адпаведны спосаб жыцця, рацыянальна есці, не курыць, не браць у рот алкаголю, займацца спортам, турызмам і... не хвалявацца.

Косці каля 40 гадоў пачынаюць курчыцца, а ўзровень мінеральных солей у арганізме (перш за ўсё ў касцях) ападае паміж 25 і 70 гадамі з 6 да 5 працэнтаў.

Лёгкія старэюць у 40-45 год. Змяшчаецца іх аб'ём і моц.

Ныркі трацяць сваю спраўнасць даволі позна, ва ўзросце 60-65 год. Найбольш шкодзяць ім... лекі, асабліва калі іх ужываюць празмерна.

Зубы павінны нам служыць да 70 год. Трэба, аднак, дбаць аб іх ад ранняй маладосці: мыць іх старанна і лячыць нават найменшыя дзірачкі.

Прадоўжыць маладосць — гэта перш за ўсё дбаць пра сябе. Нельга забывацца, што найбольшым ворагам маладосці з'яўляецца... недахоп руху, гімнастыкі, свежага паветра, ды яшчэ адно: абжорства!

Эскулап

Кансультацыя юрыста

ПЫТАННЕ: Муж і жонка на пляцы цесця пабудавалі па яго згодзе дом. Пасля іх смерці асталіся два сыны, з якіх адзін жыў з бацькамі, а другі пераехаў у іншы горад. Паміж братамі і наследнікамі цесця іх маці ўзніклі непаразуменні, паколькі тыя лічаць, што дом з'яўляўся ўласнасцю цесця, а тым самым яны маюць на яго права. Якія правы прыслугоўваюць братам і ці няма тут даўнасці, паколькі ад пабудавання дома прайшло ўжо дваццаць тры гады?

АДКАЗ: Дом з'яўляецца ўласнасцю таго, на чыім пляцы ён пабудаваны. Калі пляц цяпер з'яўляецца ўласнасцю наследнікаў цесця, па згодзе якога дом быў пабудаваны, то з'яўляецца ён уласнасцю гэтых наследнікаў. Аднак мужу і жонцы, якія пабудавалі дом, прыслугоўвала права патрабаваць, каб уласнасць пляца была перанесена на іх за грашовую кампенсацыю, калі вартасць дома большая, чым вартасць пляца. Гэтае права наследуюць іх дзеці, але толькі ва ўмовах, калі яны надалей валодаюць домам. У пададзеным прыкладзе — іх сын, які пражываў разам з бацькамі, калі надалей пражывае ў гэтым доме, мае права патрабаваць праз суд, каб наследнікі цесця перанеслі на яго права ўласнасці на пляц, на якім пастаўлены дом. Даўнасці ў гэткіх выпадках няма і не мае значэння тое, што ад пабудавання дома прайшло ўжо дваццаць тры гады.



Дарагое Сэрцайка, жыву я на вёсцы. Вучуся ў ліцэі. Паўтара года таму назад я закахалася ў Мірка — хлопца з нашай вёскі. Ён таксама мяне пакахаў. Але пасля заканчэння сярэдняй школы хлопец мой паехаў вучыцца ў далёкі горад. Калі прыязджаў дадому, свабодны час мы праводзілі разам. Было нам весела і добра. Але на канікулах я паехала на фэстын. На фэстыне я ўбачыла Мірка, але ён быў з дзвюма дзяўчынамі. Да мяне не падыйшоў. Пасля фэстына была забава, і на ёй Мірэк не гуляў увогуле, але і да мяне не падыйшоў. Я пачала гуляць з хлопцам, які завецца Янак. Але не цікавіў ён мяне, быў мне зусім абыякавы. Ад гэтага часу мы з Міркам рассталіся. Я не магла яму гэтага ўсяго дараваць. А Янка пачаў мяне наведваць. Аднак хаця я была з Янкам, але увесь час думала аб Мірку. І вось аднойчы Мірак прыехаў у нашу вёску, прыйшоў да мяне і прасіў прабачэння. Гаварыў, што кахае толькі мяне і не можа жыць без мяне. Але тады я яму не дала адказу. Сказала, што яшчэ падумаю і напішу. Але пасля ўсяго таго не ведаю, як паступіць, я страціла да яго давер. Ён далёка, і мне здаецца, што ўжо верны ён мне не будзе. Але кахаю я яго так, як калісьці. Сэрцайка, што рабіць, ці вярнуцца да Мірка, ці ўжо астацца з Янкам?

Ёлька з Гайнаўшчыны

Ёлька, мне здаецца, Мірку можна верыць. Расстанне на нейкі час якраз дае магчымасць пераканацца ў пачуццях. Так было і з Міркам, ён пераканаўся, што ў яго сэрцы толькі ты. Таму і прыйшоў і прасіў прабачэння. З Янкам хадзіць няма сэнсу. Сама ж кажаш, што абыякавы ён табе, прабываеш з ім, а думаеш пра Мірка. На жаль, хлопца аднаго другім не заменіш.

Сэрцайка

Этнаграфічнае закенца



Вёска Аўгустова каля Бельска.
Фота М. Гайдука



У лістападзе 1919 года армія Юдзеніча была разбіта, ацалелыя рэшткі яе выкінуты ў балоты Эстоніі. Балаховічу і яго „сынкам“ давялося шукаць новага гаспадара. Але, пакідаючы разбітага Юдзеніча, ён вырашыў „моцна грукнуць дзвярыма“. Пачуўшы, што былы галоўнакамандуючы Паўночна-Заходняй арміі мае намер вывезці з сабой за мяжу нарабаванае золата, Булак-Балаховіч са сваімі „сынкамі“ ўкраў свайго былога шэфа і запатрабаваў ад яго выкуп золатам. Слёзныя просьбы Юдзеніча не дапамагалі, „бацька“ быў няўмольны: яму патрэбны былі грошы, і толькі грошы. Чым бы ўсё гэта скончылася — невядома, але ўмяшаўся Чэрчыль. „Самога“ Чэрчыля Булак-Балаховіч дражніць пабаяўся і з вялікай неахвотай вызваліў з-пад варты напалоханага Юдзеніча.

„Бацька“ шукаў новага гаспадара, а галавары з так званай Беларускай народнай рэспублікі шукалі якога-небудзь авантурыста, які здолеў бы сабраць хоць нязначнае „войска БНР“. А да таго ж „бацька“ меў у Эстоніі некалькі тысяч, няхай сабе і бітых, але ўсё ж недабітых „сынкоў“. Як кажуць, рыбак убачыў рыбака. Галавары нацыяналістаў не скупіліся на пахвальбу, яны называлі „бацьку“ не інакш як нацыянальным героем. „Пра вас ведае ўжо ўся беларуская, латышская і нямецкая прэса. Усе сустракаюць вельмі прыхільна. Хутка будзе трубіць французскі, англійскі і амерыканскі друк. Крокі ўжо зроблены. Трымайцеся моцна, як бы ні было цяжка. Ваш атрад павінен прыйсці на радзіму з такім жа трыумфам, як атрад Галера ў Польшчы...“ — так пісалі нацыяналісты Балаховічу.

Але „сынкі“ Балаховіча патрэбны былі і Пілсудскаму, які старанна рыхтаваўся да паходу супраць Краіны Саветаў. І Пілсудскі мог, вядома, даць значна больш грошай, чым „правадыры“ БНР. Так Балаховіч з „сынкамі“ апынуўся ў складзе польскай арміі. У Брэст-Літоўску з дапамогай вядомага Савінкава ён значна папоўніў сваё воінства дэзерцірамі, крымінальнікамі, авантурыстамі розных колераў і адценняў. Неўзабаве гэтыя малойчыкі паказалі, што яны варты свайго „бацькі“: у час развязанай Пілсудскім польска-савецкай вайны, беручы прыклад са свайго галавара, балахоўцы арганізоўвалі яўрэйскія пагромы, расстрэльвалі раненых чырвонаармейцаў, рабавалі мясцовае насельніцтва, магазіны, цэрквы — усіх і ўсё. Апынуўшыся на тэрыторыі Польшчы пасля падпісання дагавору аб перамір'і, атаман і яго „сынкі“ „не заўважылі“, што вайна скончылася, і працягвалі рабаваць мірнае насельніцтва. На гэты раз палякаў. Справа дайшла да таго, што начальнік польскага генеральнага штаба быў вымушаны прызначыць спецыяльную камісію для расследавання зладзействаў воінства Балаховіча. І хоць балахоўцы, як устанавіла камісія, учынілі шмат злачынстваў, па сутнасці, нікога з іх не пакаралі: яны патрэбны былі Пілсудскаму.

Праз некалькі дзён Арлоўскі разам з Грынкевічам і Падгаеўскім, якіх Раўваенсавет даў яму ў дапамогу, адправіўся выканаць заданне. У патайной кішэні ён меў пасведчанне, у якім гаварылася: „Дадзена сіе супрацоўніку Упаўнаважанага РВС Захфронту тав. Арлоўскаму, што ён камандзіруецца ў Рэчыцкі і Мазырскі паветы па палітычна-сакрэтных справах. Усім ваенным і грамадзянскім уладам аказваць тав. Арлоўскаму поўнае садзеянне пры выкананні ім службовых абавязкаў. Тав. Арлоўскаму дазваляецца карыстацца ўсімі відамі сувязі, як урадавымі, так і Чырвонай Арміі. Гэтае пасведчанне дае права насіць усялякую зброю, што подпісам і пячаткай пацвярджаецца. Сапраўднае па 15 снежня“.

Па дарозе ў Рэчыцу Арлоўскі і яго таварышы даведаліся, што войскі Булак-Балаховіча прарваліся цераз дэмаркацыйную лінію і пачалі разрэкламаваны на Захадзе „вызваленчы“ паход на Беларусь.

На перадавых пазіцыях паблізу дэмаркацыйнай лініі часцей Чырвонай Арміі было мала, і войскі Булак-Балаховіча напачатку мелі некаторы поспех. Яны захапілі Петрыкаў, Мазыр, Калінкавічы. 12 лістапада ў Мазыр прыбылі сам камандуючы „рускай народнай добраахвотніцкай арміі Булак-Балаховіч і старшыня „Рускага палітычнага камітэта“ Барыс Савінкаў. Пры штабе Балаховіча знаходзіліся англійскія і амерыканскія прадстаўнікі. Беларускія нацыяналісты на ўсе лады хвалілі „вялікага правадыра“ Булак-Балаховіча, ад „імя беларускага народу“ заклікалі яго і Савінкава пазбавіць Беларусь ад „захопнікаў-бальшавікоў“. Булак-Балаховіч і на самай справе аб'явіў аб „незалежнасці Беларусі“, сябе абвясціў

ТРЫБУНА чытачоў

Кепска з аўтобусамі

У вёску Агароднікі ў гміне Нарва выязджае аўтобус з Гайнаўкі а 16^{30} гадзіне. У Агародніках начуе, а раніцай а 6^{20} едзе ў Гайнаўку. Гэты аўтобус вельмі добры і патрэбны ўсім, бо з Агароднік і Іванкаў даязджае ім многа рабочых на працу ў Нарве.

Дрэнна толькі тое, што аўтобус гэты часта ўвогуле не даязджае да Агароднік — так здараецца часам і па два разы ў тыдзень. У такім выпадку рабочыя вымушаны ісці пяшком у Нарву. Здаецца, што трэба заняцца гэтай справай — гэта ж адзіны аўтобус, які даязджае ў Агароднікі.

М. Лук'янюк



ІВАНЮК

З Іванюкоў — Іванюк,
Бацькаў сын, а дзедаў ўнук,
З вякоў вечна родам з вёскі —
Ці то Клейнік, ці то Плёскі,
Мо з Крыўца, а мо з Канюк —
Гэты самы Іванюк!
Вырас, узмужнеў, дубіна,
Ён бацькоў-старэч пакінуў,
Няўдзячны сынок родны.
Бо то ж ў вёсцы жыць не модна!
І падаўся сінявокі
Іванюк у свет шырокі.
А каб меці хлеб й да хлеба,
Працаваць усюды трэба
На грашы. Граша й не меўшы,
Ляжаш спаць, усё не еўшы.
Наташчак ля дрэнна спіцца —
Усё цыган-чарцяка сніцца,
Грошы б лёгка здабываць,
Іванюк стаў шэльмаваць.
Спрытна стаў у „ачко" іграць,
Вокам грошы пазычаць
Ў сваякоў і сябрукоў,
Ў дабрадзеяў-прастакоў.
Як пазычыць Іванюк,
Не чакай даўгу — каюк!
Ці то многа, ці то мала,
Ўсё раўно — пішы прапала!
Нат не цыкні ўспамінаць,
(Гэта ўсім карысна знаць),
Злосны робіцца, псяюха.
Раз-два можа смальнуць у вуха
Кулаком. Ў Іванюка
Два-тры кіло кулака.
І няма ў яго сарому,
На яго маланкі-грому.
Што ж то за прахвост, людцы,
А каб на яго канцы!

Гэтакае ліхадзейства
Падрывае дабрадзейства,
Губіць веру ў чалавека,
Ці ён зблізка, ці здалека,
Ці залежыць то ад нас —
Ад грамадства?

Дзядзька Квас.

„галоўнакамандуючым усіх узброеных сіл на беларускай тэрыторыі" (свой ранейшы тытул камандуючага „рускай народнай добраахвотніцкай арміі" ён перадаў брату Іосіфу, прысвоіўшы яму званне генерал-маёра) і аб'явіў аб намеры стварыць „беларускую народную армію".

Балахоўцы хутка наступалі, і ў гэтых умовах Арлоўскаму і яго памочнікам цяжка было выконваць заданне. Да таго ж у Рэчыцы яны не засталі камуніста Ратушняка, якому Рэўваенсавет даручыў стварыць адзін з атрадаў для барацьбы з бандытызмам. Арлоўскі з Грынкевічам і Падгаецкім дабраліся да станцыі Васілевічы, а далей цягнікі не хадзілі. Ім пашанцавала — на Калінкавічы ішоў бранепоезд. Аднак і на бранепоездзе праехалі мала: на станцыі Нахаў даведаліся, што вораг заняў бліжэйшы раз'езд. Тады пасланцы Рэўваенсавета пешша адправіліся ў Даманоўскую воласць. І ўсюды, дзе ішлі, расказвалі праўду пра Балаховіча і яго „сынкоў".

Гэта была вельмі небяспечная дарога. Галавары бандаў „зялёных", ап'янелыя ад поспехаў балахоўцы шалелі ад чутак пра нейкіх трох смельчакоў, якія ходзяць па вёсках, падымаюць мужыкоў супраць бандытаў. На пасланцоў фронту балахоўцы і „зялёныя" арганізавалі сапраўднае паляванне.

(Працяг будзе)

Чаму ЗУРТ так робіць?

Дарагая „Ніва", я пасылаю табе гэтыя лямпы. (Прысланыя чытачом лямпы РУ-88 знаходзяцца ў рэдакцыі, можа іх паглядзець). Можа ты пашукаеш адказу на пытанне: чаму ЗУРТ прадае сапсаваныя часці. Я, калі іх вазіў, дык нічога не мог даведацца, толькі сказалі мне пашукаць кіраўніка ЗУРТ-у. Але дзе ж мне яго шукаць?

Дарагая „Ніва", я не спадзяюся, што мне зробяць замен лямпаў ці звернуць грошы, толькі хачу, каб гэтага больш не паўтаралася. Гэтыя лямпы былі куплены 20.III.76, а звярталіся ЗУРТ-у 28.III.76. Потым так закінутыя лямпы ляжалі, і толькі цяпер я задумаў пераслаць іх вам.

Не ведаю, чаму ЗУРТ не дае гарантыі. Я, сталы чытач „Нівы", вельмі хачу пачуць, што адкажа беластоцкі ЗУРТ з Алеі 1-га Мая, дзе прадаюць такія запасныя часткі.

Аркадзь Ляўшук,
в. Ціванюкі

Трускалкі

У раёнах контрактацыі трускалак у час, калі яны даспяваюць, няма ўжо ані свята, ані нядзелі, кожны штодзень сядзіць на сваім полі і так стараецца, каб як найменш марнавалася чырвоных ягад.

Хоць да трускалкавага жніва яшчэ далекавата, але я надумаў напісаць пра мінулагодні пункт скупкі трускалак у Трасцянцы, які падлягае спулдзельні „Вітаміна" ў Бельску.

У Трасцянцы пункт скупкі трускалак вядзе Уладзімір Грыгарук са сваёй дачкой Іркай. У мінулым годзе там усё было вельмі добра арганізавана. Ніколі не было недахопу кошыкаў, і плантатараў абслужвалі вельмі ветліва, а на пункце скупкі быў прыкладны парадак.

Найгоршая справа толькі ў тым, што ад кожнага плантатара пры выплаце грошай у мінулым годзе адлічвалі на квітанцыі па 36 зл. на часопіс „Овоцэ, важыва, квяты", які кожны плантатар павінен быў атрымліваць цэлы 1976 год. І вось ужо канец сакавіка, а ніхто не атрымаў аніводнага нумара выпісанага часопіса. Тут мне здаецца, што ў бельскай „Вітаміне" выступае беспарадак, а гэты ж часопіс важны і патрэбны гаспадару, бо там ёсць парады аб хімічнай барацьбе са шкоднікамі трускалак і іншыя.

Чакаюць плантатары з раёна скупкі трускалак і трасцянцы шчырага адказу ад спулдзельні „Вітаміна" ў Бельску на пытанне.

Хто ў гэтым вінаваты? —
Не пытайся я ў Ігната,
Ці Хвядора, ці Дамінік,
Ці Раман із-пад Маліннік.

М. Лук'янюк

Як падсяваюць угнаенні?

Скардзяцца грамадзяне вёскі Канюкі. Справа датычыць падсеву штучных угнаенняў на сенажаці. Калісьці дык кожны гаспадар атрымліваў угнаенні і кожны сам іх падсяваў уласнымі рукамі. Але ў гэтым годзе пачалі сеяць інакш. У пачатку красавіка ў вёску Канюкі прыехалі аж чатыры трактары з рассявальнікамі ўгнаенняў. Былі гэта трактары сельскагаспадарчага гуртка ў Паўлах, прыналежнага СКР-у ў Заблудаве. Але як яны сеялі?

Калі ад каго дасталі ў „лапу" ці паўлітра, дык сеялі добра, а нават і загуста. А калі хто пра гэта не задбаў, або каго яшчэ на сенажаці не было, дык пасеялі толькі для славы і толькі непатрэбна пахадзілі па сенажаці. Але калі прыйдзецца плаціць за ўгнаенні, дык кожны будзе вымушаны плаціць роўна паводле сваёй сенажаці.

— На наш погляд, — гавораць Канюкі, — трэба было б аб'явіць усім людзям, што на гэтакі дзень прыедуць трактары і будуць падсяваць угнаенні. Дык каб кожны быў у вызначаны час на сваёй сенажаці. Трэба таксама, каб ад вёскі была вызначана камісія, якая б пільнавала правільнасці ў працы.

— Жадаем, — гавораць людзі, — каб у час, калі сенажаць адрасце, да нас улады прыслалі камісію, якая б уласнымі вачыма пабачыла, як вырасце трава пасля такога пасеву, як у гэтым годзе.

М. М.

НОВАЕ Ў „ДРУЖБЕ"

Чарговы год дзейнасці вучнёўскай арцелі „Дружба" ў групе сельскагаспадарчых школ у Бельску характарызаваўся далейшым павышэннем фінансавых і грамадскіх вынікаў. Членамі ў ёй стала яшчэ 102 асобы. Маёмасць арцелі ўзрасла на далейшых 9.000 злотых і дасягае сумы 90.000. Кааператыў вядзе разнародную дзейнасць: самаадукацыю, вучнёўскую крамку, займаецца зборам макулатуры, продажам падручнікаў. Хутка пачне дзейнічаць камісійны магазін гарцэрскіх рэчаў. Паявілася думка, каб заняцца апрацоўкай і продажам агародніны. У розных галінах вучнёўскай арцелі працавала 260 членаў на 367 усіх.

Фінансавы прыбытак за 1975 год узрос да 42.593 зл. Ён павысіўся ў параўнанні з папярэднім годам на 1,2 прац. Такога даходу яшчэ ніколі не было ў арцелі ад пачатку яе існавання. Было вырашана на супольным сходзе фінансаваць дзякуючы яму тры экскурсіі школьнай моладзі, некаторыя міжнародныя ўрачыстасці, былі куплены ўзнагароды найбольш актыўным кааператыўшчыкам, часткова фінансавана „стаднёўка", сустрэчы з пісьменнікамі, акцёрамі, дзеячамі. Частку грошай арцель уплаціла на будаўніцтва Цэнтра здароўя дзіцяці ў Варшаве і Інстытута здароўя дзіцяці ў Беластоку. Вучнёўская арцель „Дружба" стала сапраўды школай эканамічнага і грамадскага выхавання.

Мікалай Няплоха

УРОЧЫШЧА „ЖАРКА"

Праходзіць камасацыя сялянскіх зямель, назвы ўрочышчаў становяцца непатрэбнымі і забываюцца. А з іх можна выснаваць цікавыя вывады аб матэрыяльнай культуры нашых продкаў. Для прыкладу, возьмем урочышча „Жарка", якое распасціраецца паміж Орляй і Рудутамі. „Жарка" — гэта кустарнік. Кустарнік, як кустарнік, мала розніцца ад іншых кустарнікаў. Але вось аб чым сведчыць сама назва „Жарка". Яна сведчыць, што продкі вялі тут яшчэ жаравую гаспадарку, гэта значыць выпальвалі (выжарвалі) лес і засявалі гэтую зямлю. Калі поле станавілася малаўраджайным, яго пакідалі і зноў вырастаў там лес.

А непадалёк ад „Жаркі" знаходзіцца ўрочышча „Сэрвэта". Гэтая назва сведчыць аб тым, што ўрочышча належала і да пана, і да сялян. Пасля рэформы 1863 года пашы і лясы засталіся ў супольным уладанні і называліся сервітутамі. Але нашы людзі надта любілі і любяць перакручваць назвы. І лацінскую назву сервітус вымаўляюць „сэрвэта".

М. Л.

АКЦЫЯ „ПАРАДАК"

Па загаду Беластоцкага ваяводы кожны год вясною супрацьпажарныя каманды праводзяць парадкавую кампанію. Ужо ў сакавіку пажарнікі і армоўцы пачалі дзейнічаць. Яны кантралююць стан бяспекі на гаспадарках, на публічных дарогах і ў сялянскіх сялібах. Мэтай гэтай кампаніі з'яўляецца выключэнне ўсіх прычын, якія пагражаюць пажарамі, а таксама ўтрыманне чысціні і парадку на панадворках.

Акцыя „Парадак" — выхаваўчая акцыя. Кантралёры не караюць адразу за недахопы, а толькі загадваюць ліквідаваць іх. Калі гаспадар не зробіць гэтага, тады будзе пакараны штрафам, а нават карна-адміністрацыйнай калегіяй.

Супрацьпажарная кампанія будзе закончана ў маі. Аднак трэба помніць, што ў час другога кантролю не можа быць ніякіх недахопаў. Таму, калі нехта не выканаў яшчэ загадаў супрацьпажарнай камісіі, няхай зробіць гэта як мага хутчэй.

Ул. Сідарук

ЛЮДЗІ ВУЧАЦЦА

У красавіку дырэкцыя школы ў Луцэ закончыла двухгадовую прафесіянальную студыю для працуючых. Закончыла яе 22 асобы.

Таксама закончыўся курс на кваліфіцыраванага гаспадара, на якім вучылася 38 асоб. Сярод курсантаў былі і члены БГКТ. Віншавалі закончыўшых улады гміны Нараўка і дырэкцыя школы ў Луцэ. **(вб)**

БЕСПАРАДАК НА ВУЛІЦЫ

Вялікая і прыгожая вёска Дубіны. Ляжыць ля самага горада Гайнаўкі. Ужо многа год назад у кожную вясну праз Дубіны цяжка праехаць машынай ці фурай. Там так папсаваны брук, што завозяць ямы яловым галлём і пяском, а калі едзе аўтобус ПКС, дык так пераварочваецца з боку на бок, што страшна сядзець, бо здаецца, што перавернецца.

Каб гэты брук у Дубінак папсаваўся ў гэтым годзе, дык аб гэтым не варта было б нават успамінаць, але гэта ж ужо больш, як сем год.

Мне здаецца, што дарожныя ўлады з Гайнаўкі бачаць штодзённа вуліцу ў Дубінах, бо іх жа база змяшчаецца каля вёскі Навасады, куды працаўнікі з Гайнаўкі штодзённа даязджаюць.

Варта і жыхароў вёскі Дубіны крышку вініць, бо яны таксама павінны задбаць пра сваю вуліцу і прыняць абавязацельства грамадскім чынам дапамагчы — выканаць нефаховыя працы насупраць сваіх панадворкаў. Усе павінны старацца, каб нашы гайнаўскія вёскі прыгажэлі.

М. Лук'янюк

ПАДРЫХТАВАНЫЯ ЛЕПШ, ЧЫМ КАЛІСЬЦІ

Спулдзельня сельскагаспадарчых гурткоў у Паўночным Востраве гаспадарыць на 300 гектарах дзяржаўнага фонду. Сеюць авёс, жыта, лубін, грэчку, рапак і бульбу. Маюць 75 трактараў, з якіх 25 аддалі ў супольнае карыстанне людзям. Маюць 6 бульбакапалак, 32 касяркі, 58 снопавязалак. Амаль усе машыны адрамантаваны і чакаюць сваёй чаргі ў працы.

Кадры трактарыстаў не зусім поўныя, але ў СКР — Паўночны Востраў праводзіцца курс трактарыстаў, на якім вучацца 42 курсанты. Частка з іх пойдзе працаваць на трактары ў СКР-Паўночны Востраў.

Паслугі гаспадарам СКР робіць брыгаднай сістэмай. Гэта значыць, адной вёсцы робяць адзін дзень, а другой вёсцы — другі дзень.

Віт

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

У БЕЛЬСКУ БУДЗЕ ПАРАДАК

У 47 нумары „Нівы" з мінулага года змясцілі мы карэспандэнцыю В.С. „Адны будуюць — другія руйнуюць". Аўтар пакрытыкаваў будаўнікоў раёна XXX-годдзя ў Бельску, дзе ўпарадкаваныя траўнікі з кветкамі разбурылі потым, будуючы павільён. Аўтар закідаў выканаўцам, што трэба ўсё рабіць з планам і прадумана, каб не руйнаваць таго, што раней вялікім коштам было зроблена. Падаем адказ у гэтай справе начальніка горада Бельска.

W związku z artykułem pt. „Jedni budują, inni rujnują", zamieszczonym w gazecie „Niwa" nr 47/1030 z dnia 23 listopada 1975 roku wyjaśniam co następuje:

Na osiedlu mieszkaniowym XXX-lecia — Spółdzielni Mieszkaniowej w Bielsku Podlaskim, plan realizacyjny przewidywał budowę budynków mieszkalnych oraz 2 pawilonów, przeznaczonych na usługi osiedlowe. Budynki mieszkalne zostały zrealizowane i zakwaterowane, a teren między budynkami zagospodarowany. Budowa pawilonów natomiast do roku 1975 nie była rozpoczęta.

W ramach akcji porządkowej zaszła konieczność uporządkowania terenu od strony ulicy Mickiewicza i Nowotki, przeznaczonego pod budowę tych pawilonów. Wydobyta ziemia z wykopów została rozplantowana, a teren zasiano trawą.

Do realizacji tych pawilonów przystąpiono dopiero w roku 1975. Zaszła więc konieczność wejścia z budową na niezbędny teren, na którym został założony trawnik. Pozostała część trawnika poza ogrodzeniem przedsiębiorstwa wykonawczego, pozostała nienaruszona.

Budynki mieszkalne i pawilony na tym osiedlu zasilane są w energię cieplną z lokalnej kotłowni, zlokalizowanej od strony ulicy Kościuszki. Sieć zewnętrzna c.o. do budynków mieszkalnych została wykonana. Odcinek sieci do pawilonów nie został wykonany. Zachodzi więc konieczność wykonania pozostałego odcinka c.o. do tych pawilonów. W wykopanym odcinku rowu, o którym mowa w artykule, zostanie więc wykonany kanał i ułożona sieć c.o.

Jednocześnie nadmienia się, że omawiany teren zostanie doprowadzony do należytego porządku przed oddaniem do użytku realizowanych pawilonów usługowych.

Z-ca Naczelnika Miasta
Leoncjusz Parafiniuk

„Niwa" — Tygodnik RSW „Prasa—Książka—Ruch". Skr. poczt. 149. 15-950 Białystok. TELEFON 2-32-41. Wydawca Przedsiębiorstwo Wydawniczo-Kolportażowe RSW w Białymstoku. PRENUMERATA: Oddziały „Ruchu", urzędy pocztowe i listonosze. Indeks 36911/36671.

Важкі аргумент

Толькі я сеў за чарговую байку, як на стале перада мною нечакана з'явілася маленькая Мышка.

— Стой! — дрыжачым ад гневу голасам піснула яна. — Зноў ты ўзяўся пісаць паклёп!

— Я?

— Менавіта ты! Хоць, на жаль, ты не адзінокі! Усе вы, — вочы мышкі бліснулі халодний пагардай, — байкапісцы, прыпісваеце нам, жывёліне, гадкія справы і характары, уласцівыя вам самім!

— Ах ты вось аб чым! Гм... Гэта... бачыш... вобразнае, так сказаць, мысленне... пошукі новых форм...

— Новыя формы? Ад Эзопа да цябе? Ха-ха-ха... Перастань здзіўляць. Адкажы па сутнасці: чаму тысячы год вы надзяляеце нас, жывёлін, у сваіх байках ілжывасцю і крывадушнасцю, дурнотай і подласцю, хітрасцю і каварствам?...

— А чаго гэта ты, уласна, так распішчалася? — разззлаваўся я. — Хто ты сама? Звычайны бязмоўны грызун-эгаіст! Як ты можаш наваг параўноўваць сябе з людзьмі? Мы разумныя, красамоўныя, надораны высакароднай душой...

— Дапусцім, — піснула мая субяседніца. — Але дзе ж у такім выпадку ваша смеласць? Чаму вам не хапае элементарнай храбрасці выказаць адзін другому ў вочы ўсё, што вы думаеце? Чаму вы ўжываеце ўсялякія там алегорыі, прыкрываецеся намі, размаўляеце на гэтай сваёй эзопавай мове? Чаму?

На самай справе, чаму? Як вытлумачыць ёй усё гэта? У пошуках важкага аргумента позірк мой спыніўся на тоўстай анталогіі вялікіх байкапісцаў. Я ўзяў перапалоханую у адзін том Эзопа, Лафантэна і Крылова і трахнуў Мыш класікамі па галаве.

Потым я кінуў яе спаўшаму пад сталом Кату. Ён успомніў крылоўскага Ваську і, мурлыкаючы, ляніва выканаў свой абавязак.

Цікава, ці зразумела мяне Мыш?

Фёдар Шашун
(Югаславія)

— *Эй, Пятрусь! Ужо перапынак на снеданне закончыўся!*

НІЎКА

З ЖЫЦЦЯ ВЫШЭЙШЫХ СФЕР

— *Яго вялікасць чакае.*

АПРАЎДАЎСЯ

Міколка вярнуўся са школы дадому. Глянула маці, а яго новая шапка ўся брудам перапэцкана.

— Што гэта?

— Ды гэта хлопцы...

— Што хлопцы?

— Схапілі ў мяне шапку і сталі ў футбол гуляць...

— А ты ж дзе быў?

— У варотах стаяў.

КАСТУСЬ У ТЭАТРЫ

Парфен, выходзячы з тэатра, пытае ў Кастуся:

— Як табе ўдалося разгледзець што-колечы на сцэне? Перад табой сядзела такая вялізная пані!

— Гэта было нятрудна: у яе было праколата вуха.

— *Чаго ў спорце не бывае!*

МІНІВЕРШЫ

МУХА

Аднойчы з Мухі
зрабілі Слана.
Цяпер у начальніках
важных яна.

А. Часоўнікаў

...Пакарыў жанчыну. Цяпер яна яму варыць і мые.

...Яго званне: Кавалер Марыі Іванаўны.

НА ШЫРОКІМ СВЕЦЕ

Двое англічан спрачаюцца аб паходжанні чалавека.

— Самае галоўнае для мяне тое, што я чалавек. І мне абсалютна абыякава, ці быў мой прадзядуля малпай.

— Так, але як было вашай прабабулі?

* * *

„Дружа, дай цыгарэту, разумееш, няма нідзе паблізу крамы, каб купіць. Вось табе 10 стоцінак", — так хітраваў кожны раз адзін габравец. Прахожыя, зразумела, давалі яму цыгарэту і не бралі грошай.

Але аднойчы на сафійскім вакзале чалавек, які даў яму цыгарэту, спакойна забраў 10 стоцінак. Здзіўлены хітрун паспеў толькі запытаць:

— Вы адкуль?

— З Габрава, — дастойна адказаў чалавек.

ГУМАР З

БУДЗЬ І ТЫ ЗАДАВОЛЕНЫ

Адзін паэт у сваіх вершах расхваліў багацея. Той быў вельмі задаволены. Ён сказаў паэту:

— Друг, грошай у мяне няма, а вось зерня многа. Прыходзь заўтра.

Паэт прыйшоў на наступны дзень. Багацей запытаўся:

— Чаго ты прыйшоў?

— А ты казаў, што дасі мне зерня, вось я і прыйшоў.

Багацей сказаў тады:

Ты парадаваў мяне словамі, дык будзь задаволены сам маімі словамі.

У МУЗЕІ

— *Мама, ці доўга ён яшчэ будзе выцягваць стрэмку з нагі?*

ВЫКАНАЎ

Доктар Знахарук усміхнуўся, убачыўшы хворага:

— Вы сёння выглядаеце лепш.

— Так. Я выканаў указанні на этыкетцы бутэлькі вашага лякарства.

— Якія менавіта?

— Бутэльку трымаць шчыльна закупоранай.

ВАДЗЩЕЛІ

Двое п'яных едуць на машыне.

— Калі мы пераедзем мост, паварачвай направа.

— Як? Ці ж не ты вядзеш машыну?

ПАРАІЎ

Дама скардзіцца адвакату на мужа, якога ненавідзіць.

— Дык развядзіцеся! — кажа адвакат.

— Ну, не! — адказвае дама. — Я мучылася з-за яго дваццаць год, а цяпер вы прапануеце мне яго ашчасліціць!

Без слоў.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Ірэны Несцярук з Дубіч Царкоўных, Валі Наумюк і Гені Нічыпарук з Клейнік, Марыі Петрышчук і Раісы Леўчук з Тыневіч Вялікіх, Надзеі Нікіцюк са Ступнік, Галіны Лук'янюк і Ірэны Касцюк з Кожына, Яўгеніі Аніщчук, Янкі Апалінскага, Юркі Якімюка, Лявона Андрэюка з Зубава, Зінаіды Іванюк і Уладзіміра Парфенюка з Трашчотак змяшчаем песню:

Staruszek świat

słowa: Jerzy Kleyny
muzyka: Wojciech Trzciński
śpiewa: Anna Jantar

\- — -

Nasz zalatany świat
Z siedemdziesiątych lat,
Niewiele czasu sam
Dla siebie mam...
A po zamknięciu bram
Po dyskotekach gra,
Bo —
młody rytm,
Beat, nie beat,
Porywa go...
Skąd on to zna?
Co wieczór to
Przynosi z dnia!

\- — -

Staruszek świat
Nie wygląda na tyle lat,
Staruszek świat,
Jeszcze w klapie by nosił kwiat...
Staruszek świat,
Lubi wspomnieć niemodny czas,
Choć spieszno mu,
Choć mu pilno do gwiazd!

\- — -

Nasz zwariowany świat
Z siedemdziesiątych lat,
Zatańczy walca raz
Na jakiś czas...
I pójdzie z rąk do rąk,
Za neonowy krąg —
I —
Raz, dwa, trzy
Raz, dwa, trzy,
Pomiesza dni,
Pomyli sny... —
Staruszek świat,
Nie taki zły!

ЗАГВОЗДКА

Задрыпанцы гміна зафундавала велізарную пажарную машыну. Жыхары жыва абмяркоўваюць гэту падзею:

— Уяві, колькі трэба пажараў, каб апраўдаць такую пакупку.

Курёзы

ГОРКІ ЖАРТ

Злучаныя Штаты Амерыкі рыхтуюцца ў ліпені гэтага года ўрачыста адзначыць двухсотгоддзе сваёй незалежнасці. У плане падрыхтоўкі да гэтага свята ёсць і такое грандыёзнае мерапрыемства. Праз увесь амерыканскі кантынент будзе працягнуты людскі ланцуг. Людзі будуць стаяць, узяўшыся за рукі. Даўжыня гэтага жывога ланцуга працягнецца на 4.500 кіламетраў. Для гэтага мерапрыемства спатрэбіцца каля чатырох мільёнаў чалавек.

Вострыя на язык амерыканцы жартуюць з гэтай нагоды. Яны гавораць, што для таго жывога „ланцужка" не варта будзе адрываць ад работы працуючых суайчыннікаў. Для гэтага хопіць з лішкам і беспрацоўных, якіх налічваецца ў краіне каля васьмі мільёнаў.

Дужа горкі жарт.

„МУДРЭЦ З МУДРАЦОЎ"...

Такі „тытул" небескарысліва прысвоіў сабе венскі масажыст Іаган Херстэр. Даўшы зразумець, што ён жыве на свеце не адно стагоддзе і шмат чаго пабачыў на сваіх вяках, „мудрэц" пачаў шантажыраваць нейкага Алоіза Рэша. Херстэр сцвярджаў, што быў сведкам злачынства Рэша ў „папярэднім жыцці". „Тады ён задушыў свайго брата ў тыбецкім манастыры, — містыфікаваў ён 82-гадовага багацея. — А было гэта 640 гадоў назад. Бог табе не даравае..." Рэш упрошваў Херстэра дапамагчы яму „загладзіць грэх". Херстэр „дакладна" падлічыў, што гэта будзе каштаваць „забойцу" 438.418 долараў і два цэнты.

Смяецца з намі

Прызнавай свае памылкі. Але дробныя.